Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

18 ЖНІЎНЯ 2020 г. АЎТОРАК № 159 (29273)

ЛЁС ПРЫВАТНАГА ДОМА 7

МАРШРУТ ПА БЕЛАРУСКІМ «ЗАМЕЖЖЫ» 9

Фальварак пад Гародняй

Фота БелТА.



Сядзібны комплекс пад Гроднам у XVIII стагоддзі знаходзіўся ва ўладанні гарадзенскага старасты Антонія Тызенгаўза, пад кіраўніцтвам якога былі ўзведзены жылыя і гаспадарчыя пабудовы, разбіты сад. У пачатку XXI стагоддзя маёнтак быў адноўлены як аграсядзіба.

ISSN 1990 - 763X

З ЭКАНОМІКІ — У ПАЛІТЫКУ

Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка наведаў Мінскі завод колавых цягачоў і пагутарыў з рабочымі

Сказаць шчыра, ехаць учора на МЗКТ у складзе прэзідэнцкага пула было крыху трывожна. Але, як высветлілася, трэба менш чытаць тэлеграм-каналаў... Быў толькі адзін момант, калі, здавалася, сапраўды Прэзідэнту (і, адпаведна, блізкаму асяроддзю) пагражала фізічная небяспека. У натоўп ён пайшоў свядома — здолеў пераламіць настрой натоўпу, і далей усё пайшло як у цывілізаваных людзей.

Аляксандр Лукашэнка. Перспектывы, зарплата павінны казаць самі за сябе.

«Іх проста трэба адзін раз папярэдзіць: ***хто выйдзе за вароты, назад не вернецца. Гэта ж абароннае прадпрыемства.*** Што тут тлумачыць?» — сказаў ён.

У цэху завода Прэзідэнт спяршу падышоў да карэспандэнтаў, каб яшчэ раз запэўніць у тым, што журналістам і іх сем'ям будзе забяспечана ўсеагульная дапамога і абарона.

«Яны атруцілі людзей сацсеткамі, і ў некаторых склалася думка: усё, улады няма, улада пала... Улада ніколі не падзе. А з імі мы разбяромся. Недзе трэба пацярпець, а недзе проста патрэбны час», — звярнуўся да журналістаў кіраўнік дзяржавы.

«Ніколі вы ад мяне не дачакаецеся, каб я пад ціскам нешта зрабіў», — адказаў людзям Аляксандр Лукашэнка, якія неаднаразова перарвалі яго словамі «Сыходзь!»

Што да пытання наконт неспраўдлівых выбараў і перавыбараў, Прэзідэнт заявіў: «Мы правялі выбары. Пакуль вы мяне не заб'еце, іншых выбараў не будзе».

Аляксандр Лукашэнка звярнуўся і да тэмы гвалту на вуліцах: «Патрэбна была нагода, каб вы крычалі «Сыходзь!» — добрая нагода. Вы ведаеце, што я даручыў разабрацца з кожным фактам». Па яго словах, пацярпелі тыя, хто нападаў на праваахоўнікаў, правакаваў іх.

Прэзідэнт падкрэсліў, што МЗКТ — суб'ект эканамічнай дзейнасці, але частка супрацоўнікаў перайшла ў палітычную плоскасць.

«Запомніце: там, у палітыцы, куды вы рынуліся, не разумеючы, іншыя законы. Каб потым не было балюча ні мне, ні вам, ні народу, калі мы страцім дзяржаву», — папярэдзіў Аляксандр Лукашэнка.

Хоць выкрыкі з натоўпу на адрас кіраўніка дзяржавы былі агрэсіўныя, пасля прамовы ён адзін выйшаў у гушчу народу, перасцярогшы ад правакацый.

«Калі вы хочаце задаць кіраўніку дзяржавы пытанне, задавайце яго. Але любы ваш крок у мой бок абернецца вам... Я не пагляджу, што вас тут групка гэта стаіць, — вы не на таго нарваліся», — сказаў Прэзідэнт, пасля чаго натоўп крыху сцішыўся.

Рабочы Андрэй звярнуўся да Аляксандра Лукашэнкі з просьбай аб сумленных выбарах. Прэзідэнт прапанаваў праверыць дакументы на любым выбарчым участку. Але, усведамляе кіраўнік дзяржавы, сёння гэта нікому не патрэбна, бо патрэбны новыя выбары.

«Іх не будзе, таму што не будзе ні МЗКТ, ні МАЗа, ні БелАЗа — за паўгода мы знішчым усё», — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка.

«Трэба ўсё захаваць», — пагадзіўся Андрэй.

Прэзідэнт выказаў думку, што становішча спросціцца пасля прыняцця на рэферэндуме новай Канстытуцыі і правядзення выбараў у адпаведнасці з ёй.

«Я згодны», — адказаў рабочы.

Ад выкрыкання лозунгаў рабочыя паспрабавалі перайсці да канструктыву. Людзі самі пачалі абрываць адно аднаго: «Цішэй, не чутно! Дайце ўсім запытацца!»

Рабочая Наталля са слязьмі расказала, як яе дачка вярнулася з крамы з перабітымі рэбрамі. Жанчына сама прызнала, што бацькоўскія пачуцці аднолькавыя ў маці АМАПаўца, і ў маці пацярпелага. Потым пагадзілася з Прэзідэнтам, што масавыя акцыі павінны праходзіць у адпаведнасці з заканадаўствам.

«Сітуацыю не я стварыў. Яе стварылі. Чаму АМАПаўцы апынуліся на вуліцах, што, ім так захацелася? Не. Іх вывелі туды — навесці парадак. ***Галоўнае было не даць разрастацца гэтым ачагам»,*** — растлумачыў Аляксандр Лукашэнка.

Фота Белтă.

Па прыбыцці кіраўніку дзяржавы далажылі, што завод працуе ў штатным рэжыме. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ў краіне працуюць усе прадпрыемствы, нягледзячы на тое, што некаторыя «бадзяюцца» — іх каля сотні чалавек на кожным буйным заводзе.

«Дрэнны» Прэзідэнт трымаў лішак людзей, каб на вуліцу не выкідваць. Не хочуць працаваць, мы іх не прымусім», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Работа ў людзей на МЗКТ ёсць, калектыўны дагавор выконваецца. Сярэдняя зарплата — амаль паўтары тысячы рублёў. Прадпрыемства ўтрымлівае першае месца ў галіне машынабудоўлі. Ёсць пэўныя незадаволеныя — тлумачыць ім няма чаго, упэўнены

Ён падкрэсліў: сёння немагчыма гарантаваць, што сілы, якія падцягваюцца звонку, не пагражаюць краіне. Па яго словах, Прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін пагадзіўся, што «заварушка нездарма».

АД ЛОЗУНГАЎ ДА КАНСТРУКТЫВУ

На тэрыторыі завода Прэзідэнта чакалі негатыўна настроеныя рабочыя.

«Самае страшнае ў жыцці — гэта здрада. ***Я не хачу вас папракнуць, што вы камусьці здрадзілі,*** бо я добра ведаю, што адбываецца», — сказаў Прэзідэнт і прапанаваў рабочым азнаёміцца з аператыўнай інфармацыяй — запісам тэлефоннай размовы аб падрыхтоўцы акцыі пратэсту.

КВАТЭРА ПРАЗ ДВА ГАДЫ

«Мяне вы на калені не паставіце. І не рабіце, каб было горш — перш за ўсё вам і вашым сем'ям. Вы гэта адчуеце праз тыдзень, калі зробіце бязладдзе на прадпрыемстве», — заклікаў Прэзідэнт.

Ён адказваў на ўсе пытанні, у тым ліку і такія, якія мелі на мэце справакаваць на негатыў. Потым людзі звярнуліся да надзённага: шматдзетны бацька скардзіўся, што жыве ў кватэры цешчы, але вельмі хоча ўласную.

«Да канца года ***чарга для шматдзетных не перавысіць года»,*** — удакладніўшы тэрмін у старшыні Мінскага гарвыканкама Анатоля Сівака, праінфармаваў мужчыну Прэзідэнт.

«Мы хочам, каб улада належала народу, а народ учора (у нядзелю. — **«Зв.»**) выйшаў і паказаў сваё меркаванне», — звярнуўся да кіраўніка дзяржавы другі рабочы.

«Вынікі гэтых выбараў мы перагледзець не будзем, таму што гэта патрабаванне не вас нават, не гэтых рабочых. Гэтыя патрабаванні адтуль ужо скінулі. Заўтра ж вас паставяць яшчэ ў ланцуг з Вільнюса да Кіева, каб прадэманстраваць, што трэба ***стварыць «санітарны кардон» паміж Расіяй і Захадам*** — лічы, супраць Расіі. Вы хочаце, каб Расія адрэагавала яшчэ? А я не хачу», — рэзюмаваў Аляксандр Лукашэнка.

Трансляцыя прамовы Прэзідэнта была наладжана на МТЗ, МАЗ, «Інтэграл», завод імя Казлова ў Мінску і шэсць буйных прадпрыемстваў па краіне: «Белкалій», «Белшына», БелАЗ, БМЗ, «Нафтан» і «Палімір».

Пасля размовы Прэзідэнт нечакана нават для суправаджаючых асоб змяніў маршрут і наведаў некалькіх цэхаў МЗКТ і цэх аўтобуснага завода ААТ «МАЗ».

РАБОЧЫХ — НА ВУЛІЦУ?

На галоўным канвееры Мінскага завода колавых цягачоў Аляксандр Лукашэнка пазнаёміўся з супрацоўніцай Тамарай, паклікаў падысці бліжэй хлопцаў-рабочых. Адзін з іх, Юрый, пацікавіўся падтрымкай шматдзетных сем'яў, аб чым Прэзідэнт расказаў крыху раней.

«Бастуюць — ідзіце бастуйце. Але не цкуйце людзей, якія хочуць працаваць. ***Я не думаю, што бацьку трох дзяцей трэба нешта іншае»,*** — заўважыў кіраўнік дзяржавы. Ён папярэдзіў аб небяспецы прыватызацыі буйных прадпрыемстваў кшталту Мінскага завода: з 4500 рабочых па бізнес-плане засталося б 2500.

«А дзве тысячы — на вуліцы? Вось што будзе з інвестарамі. Яны з задавальненнем возьмуць, Расія возьме, таму што ***вы робіце тое, што ім вельмі патрэбна для стрымлівання ядзерных сіл»,*** — перасцярог Прэзідэнт.

Варвара МАРОЗАВА.

Слова парламентарыю

Дэпутат Валерый ВАРАНЕЦКІ:

«Меркаваў бы правільным у гэтай сітуацыі стварыць нешта накшталт нацыянальнага савета або круглага стала»

«Звязда» папрасіла пракаментаваць падзеі, якія адбываюцца ў Беларусі, члена Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі па міжнародных справах Валерыя Варанецкага.

— Валерый Іосіфавіч, як вы ацэньваеце сітуацыю, што склалася ў краіне?

— Відавочна, што ў краіне склалася вельмі складаная, крызісная сітуацыя. У гэтых умовах нам усім трэба быць асабліва ўважлівымі адно да аднаго, паважаць розныя пазіцыі і пункты гледжання, не дзяліць грамадства на сваіх і чужых... Трэба захаваць грамадзянскі мір і згоду ў краіне. Гэта самае важнае. Меркаваў бы правільным у гэтай сітуацыі стварыць нешта накшталт нацыянальнага савета або круглага стала, які стаў бы месцам абмеркавання шляхоў выхаду з крызісу і далейшага развіцця нашай краіны. Натуральна, што ў ім павінны ўдзельнічаць аўтарытэтныя прадстаўнікі ўлады і грамадзянскай супольнасці, палітычных сіл, грамадскіх дзеячаў, рабочага руху, царквы і г. д. І, вядома, удзельнікаў прэзідэнцкай «гонкі».

Вельмі важна сёння таксама забяспечыць неўмяшанне знешніх акцёраў у нашы ўнутраныя справы і нашу ваенна-палітычнаю бяспеку. У сувязі з гэтым хачу нагадаць аб гарантыях бяспекі, дадзеных Беларусі з боку Расіі, ЗША, Вялікабрытаніі і Францыі ў Будапешцкім мемарандуме 1994 года.

— Што зараз адбываецца ў парламенце, як дэпутаты рэагуюць на шматлікія заявы пра насілле з боку праваахоўных органаў падчас дэманстрацый у перыяд з 9 да 14 жніўня?

— Дэпутаты ў цяперашні час працуюць у парламенце і акругах. У пятніцу група дэпутатаў сустракалася ў парламенце з праваабаронцамі, прадстаўнікамі БАЖ, грамадзянскай супольнасці, каб абмеркаваць становішча, якое склалася ў краіне, і самыя болевыя і праблемныя пытанні, якія хвалююць усіх нас. Размова атрымалася вельмі эмацыянальная, зацікаўленая і, спадзяюся, карысная. Натуральна: усе мы вельмі балюча перажываем за тое, што адбываецца ў грамадстве і краіне.

— Ці ёсць асабіста ў вас сумненні ў адсутнасці маштабных фальсіфікацый падчас сёлетніх прэзідэнцкіх выбараў?

— Цяпер у сецыве з'явілася досыць сведчанняў разнастайных фальсіфікацый падчас выбараў. Ёсць і адпаведныя звароты ў пракуратуру, да праваахоўных органаў. Усім фактам фальсіфікацый неабходна даць адпаведную прававую ацэнку. Мы ўсе хочам справядлівасці і сумленных выбараў. Гэта вельмі важна.

— Як вы можаце пракаментаваць заявы вашых калег па дыпламатычнай службе аб падтрымцы пратэснага руху ў краіне?

— У кожнага з нас заўсёды ёсць выбар. І кожны мае права рабіць яго так, як лічыць для сябе магчымым. Але трэба памятаць, што галоўнае для ўсіх нас — захаваць грамадзянскі мір, згоду і давер у грамадстве, захаваць і ўмацаваць наш агульны дом — нашу родную Беларусь — у якім жывём мы і ў якім будуць жыць нашы дзеці і ўнукі.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

На сувязі крызісныя псіхолагі

У прадстаўніцтве Дзіцячага фонду ААН (ЮНІСЭФ) у Беларусі намерваюцца сфакусіравацца на рабоце, якая здольная дапамагчы ўсім: і бацькам, і дзецям, пацярпелым у час пратэстных акцый. Зараз яны ўдасканальваюць сістэму гэтых паслуг і збіраюцца стварыць сістэму, якая дазволіць аб'яднаць крызісных псіхолагаў, дапамога якіх цяпер патрэбная як ніколі.

— Спецыялісты, якія пабывалі каля месцаў часовага ўтрымання грамадзян, кажуць, што шмат псіхолагаў і валанцёраў ужо гатовыя аказаць дапамогу і намагаюцца гэта рабіць. Аднак патрэбны ўдзел прафесіяналаў, бо людзі, якія пацярпелі, перажылі моцны шок, — акрэсліў **Дзмітрый ШЫЛІН, старшы каардынатар па пытаннях аховы дзяцінства Дзіцячага фонду ААН (ЮНІСЭФ) у Беларусі.** — Каб гаварыць з імі, патрэбны тыя, хто ведае крызісную псіхалогію, а такіх спецыялістаў у краіне, на жаль, няшмат, і іх патэнцыял трэба зараз аб'яднаць.

Нагадаем, што юрыдычную дапамогу бацькам і дзецям прадстаўніцтва ЮНІСЭФ разам са спецыялістамі Беларускай рэспубліканскай калегіі адвакатаў пачало аказваць праз чат-бот у Telegram @kids_lawyer_bot яшчэ з 22 ліпеня. Па серадах з 16.00 да 18.00 можна абмеркаваць пытанні грамадзянскага і сямейнага права. Штодня людзям дапамагаюць разабрацца з акалічнасцямі крымінальнай і адміністрацыйнай адказнасці.

Калі дзіцяці і яго бацькам патрэбна юрыдычная дапамога, тэрміновая кансультацыя або неабходна даведацца, дзе знайсці найбліжэйшага адваката, можна таксама звярнацца па бясплатную кансультацыю да Telegram-бота, параіў каардынатар дзіцячага фонду ЮНІСЭФ:

— Людзі, якія сталі сведкамі гвалту, могуць адчуваць цяжкія перажыванні: разгубленасць, неразуменне, дэзарыентацыю, боль, страх, бяссілле. З наступствамі псіхалагічнай траўмы цяжка справіцца нават даросламу, але асабліва ад гэтага пакутуюць дзеці, у якіх менш жыццёвага вопыту і ведаў. Каб разам дапамагчы малым, мы падрыхтавалі кароткія чэк-лісты пра тое, як дапамагаць дзецям розных узростаў. Іх можна знайсці па спасылцы https://www.unicef.by/press-centr/395.html.

Ірына СІДАРОК.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

У Расіі пачалася вытворчасць вакцыны ад каранавіруса

Вытворчасць вакцыны супраць каранавіруса, якая распрацавана Нацыянальным даследчым цэнтрам эпідэміялогіі і мікрабіялогіі (НІЦЭМ) імя Гамалеі Міністэрства аховы здароўя РФ, пачалося ў Расіі. Пра гэта паведамляе ТАСС са спасылкай на прэс-службу Міністэрства аховы здароўя.

«Пачата вытворчасць вакцыны ад каранавіруснай інфекцыі COVID-19, распрацаванай НИЦЭМ імя Гамалеі Міністэрства аховы здароўя Расіі», — гаворыцца ў паведамленні.

Расія 11 жніўня першая ў свеце зарэгістравала вакцыну ад каранавіруса, яна атрымала назву «Спадарожнік V». Прэпарат быў распрацаваны Нацыянальным даследчым цэнтрам эпідэміялогіі і мікрабіялогіі імя М. Ф. Гамалеі і прайшоў клінічныя выпрабаванні ў чэрвені—ліпені. Ён заснаваны на ўжо вядомай платформе, на якой стварылі яшчэ шэраг вакцын. Кіраўнік беларускага Фонду прамых інвестыцый Кірыл Дзмітрыеў заяўляў, што Расія ўжо атрымала заяўкі ад 20 краін на пастаўку 1 мільярда доз вакцыны.

ВУП Японіі скараціўся на рэкордныя за 40 гадоў 27,8 %

ВУП Японіі з-за ўведзеных абмежавальных мер для недапушчэння распаўсюджвання COVID-19 за другі квартал бягучага года (з красавіка да чэрвеня) скараціўся на рэкордныя 27,8 % у параўнанні з папярэднім кварталам, паведамляе японская тэлерадыёкампанія NHK.

Па звестках канцылярыі кабінета міністраў Японіі, гэта стала найбуйнейшым падзеннем з 1980 года, калі ў краіне пачалі весці падобную статыстыку.

З 7 красавіка ў Японіі дзейнічаў абвешчаны ўрадам рэжым надзвычайнай сітуацыі. З канца мая ўлады паступова сталі аслабляць меры, якія закранулі эканамічную актыўнасць у краіне.

Як паведамляе агенцтва Kyodo, спажывецкія выдаткі ў краіне знізіліся на 8,2 % у параўнанні з папярэднім кварталам. Экспарт тавараў і паслуг скараціўся на 18,5 %.

Па звестках на 17 жніўня, у Японіі зарэгістравана больш за 56,9 тысячы выпадкаў заражэння каранавіруснай інфекцыяй, памерлі 1116 чалавек.

Пасля выбуху ў Бейруце ў партах Егіпта ўтылізуюць небяспечныя рэчывы

Пасля разбуральнага выбуху, што прагрымеў у сталіцы Лівана Бейруце 4 жніўня, у Егіпце прынята рашэнне ўтылізаваць усе небяспечныя рэчывы, якія захоўваюцца ў марскіх партах краіны. Пра гэта паведаміў міністр фінансаў Егіпта Мухамед Мааіт, перадае ТАСС.

«Тое, што здарылася ў Бейруце, прымусіла нас вывучыць нашу ўласную сітуацыю, і мы ўжо нават пазбавіліся ад вялікай колькасці закінутых і безгаспадарных небяспечных матэрыялаў, якія знаходзіліся ў партах», — адзначыў міністр. Ён дадаў, што да снежня гавані Егіпта будуць цалкам ачышчаны.

Прычынай трагедыі ў Ліване стала тое, што падчас зварачных работ адбылося ўзгаранне звыш 2,7 тысячы тон аміячнай салетры, канфіскаванай мытнымі службамі шэсць гадоў таму. У выніку выбуху былі знішчаны і пашкоджаны тысячы дамоў, больш за 300 тысяч чалавек засталіся без прытулку. Загінулі 178 чалавек, пацярпелі каля 6 тысяч. Дзясяткі лічацца зніклымі без вестак.

У Лондане памёр унук Нурсултана Назарбаева Айсултан

У Лондане памёр Айсултан Назарбаеў — унук першага прэзідэнта Казахстана Нурсултана Назарбаева і сын экс-спікера Сената Дарыгі Назарбаевай, паведамляе партал zakon.kz.

«Сёння ноччу ў Лондане памёр Айсултан Назарбаеў. Прычына смерці высвятляецца. Папярэдне — спыненне сэрца. Іншыя падрабязнасці пакуль невядомыя. Праз некалькі дзён Айсултану Рахатавічу споўнілася б 30 гадоў», — гаворыцца ў паведамленні.

Жніво-2020

ЛІДЗІРУЕ МОЛАДЗЬ

На мінулым тыдні ў Магілёўскім раёне ўшаноўвалі лідараў жніва — раён першы ў вобласці дасягнуў планкі ў 100 тысяч тон па зборы збожжавых і зернебабовых.

Перадавікоў віншавалі проста ў полі адной з найлепшых гаспадарак — ЗАТ «Агракамбінат «Зара». Са словамі падзякі да працаўнікоў звярнуліся намеснік старшыні аблвыканкама Руслан Страхар і старшыня Магілёўскага райвыканкама Алег Чыкіда. Разам з прывітальным адрасам аблвыканкама яны ўручылі сертыфікат на трактар «Беларус».

Між тым жніво набірае абароты. Знамянальна, што на раніцу ўчарашняга дня лідзіраваў маладзёжны экіпаж стрыечных братоў Андрэя і Сяргея Драздоў — камбайнераў ААТ «Рассвет» імя К. П. Арлоўскага Кіраўскага раёна. Іх вынік — больш за 3025 тон.

Экіпаж Мікалая Дарэчкіна і Канстанціна Саладухі з СВК «Калгас «Радзіма» Бялыніцкага раёна намалаціў амаль 2751 тону збожжа і больш за 593 тоны рапсу. А камбайнеры ААТ «Рассвет» імя К. П. Арлоўскага Кіраўскага раёна Валерый Піскуноў і Юрый Нікіфаравец сабралі 2383,8 тоны збожжа. Механізатар ААТ «Александрыйскае» Шклоўскага раёна Аляксандр Якуцін у адзіночку намалаціў на сваім КЗС 2236 тон.

Сярод кіроўцаў на ўчарашні дзень лідзіраваў Павел Ціханаў з ААТ «Амкадор-Шклоў» Шклоўскага раёна, які перавёз амаль чатыры тысячы тон збожжа і рапсу.

Самая высокая ўраджайнасць збожжавых па вобласці — 57,6 цэнтнера з гектара — «Агракамбінат «Зара» Магілёўскага раёна. На 0,6 цэнтнера саступае ААТ «Александрыйскае» Шклоўскага раёна, 55,6 цэнтнера з гектара ў СВК «Калгас Радзіма» Бялыніцкага раёна.

На раніцу ўчарашняга дня ў вобласці было сабрана 844 тысячы тон збожжа, сярэдняя ўраджайнасць склала 36,2 % цэнтнера з гектара.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

Перазагрузка

І Ў «ПРАВІНЦЫІ» МОЖНА ЖЫЦЬ

Полацкі раён — адзін з адзінаццаці ў краіне, дзе рэалізуюцца комплексныя планы паскоранага развіцця.

Асаблівасць рэгіёна ў тым, што ў гэтай «калысцы гарадоў беларускіх» і навакольлях заўсёды шмат турыстаў. І ўсё больш замежных. Прагрэс у рэгіёне — гэта добрая «рэклама» для краіны ў цэлым.

Старшыня Полацкага райвыканкама Ігар МАРКОВІЧ канстатуе, што кожны жыхар можа прапанаваць і зрабіць, на яго погляд, нешта значнае і важнае для краю. І ўжо параўнальна шмат што зроблена.

Усяго ж трэба ажыццявіць каля 250 мерапрыемстваў. Сярод іншага — паляпшэнне дзейнасці ЖКГ, прадпрыемстваў прамысловага комплексу, аховы навакольнага асяроддзя, павелічэнне занятасці і гэтак далей. Ужо асвоена 276,9 мільёна рублёў, або 72 % аб'ёму фінансавання, прадугледжанага на два гады. Напрыклад, у студзені — маі тэмпы росту вытворчасці прадукцыі сельскай гаспадаркі склалі 108,9 %. У параўнанні з такім жа перыядам мінулага года, інвестыцый у асноўны капітал і аб'ёмаў будаўніча-мантажных работ — адпаведна 105,9 і 181,1 %.

Атрыманы чысты прыбытак 80,5 мільёна рублёў. Гэта ў 4,8 раза больш, чым за адпаведны перыяд летась. А рэнтабельнасць продажаў склала 4, 5 %.

Нядаўна пытанне абмяркоўвалася на пасяджэнні ў Віцебску. Першы намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Алег Мацкевіч даступна растлумачыў галоўную задачу: «Перазагрузка» патрэбна перш-наперш для таго, каб багацей, лепш жылося, каб людзі адчувалі, што і ў правінцыі можна добра жыць. А гэта залежыць ад аздараўлення стану эканомікі, ад адкрыцця новых вытворчых плошчаў, з'яўлення новых прадпрыемстваў, прыцягнення інвестыцый у розныя галіны.

Віцэ-губернатар даручыў мясцовай уладзе для паскарэння «перазагрузкі» актыўней шукаць крыніцы фінансавання. У тым ліку і за кошт супрацоўніцтва з замежнымі структурамі (напрыклад, у рамках праграм ЕС, Саюзнай дзяржавы).

Паралельна неабходна паскарацъ развіццё і іншых раёнаў. На Віцебшчыне, напрыклад, гэта Наваполацк і Аршаншчына.

Ды і мясцовыя жыхары яшчэ не раскрылі цалкам свой патэнцыял у сферы прадпрымальніцтва. Ад прыёму турыстаў у вёсках да арганізацыі невялікіх фірмаў — мясцовая ўлада ў выпадку любой ініцыятывы гатова падставіць плячо. Пры гэтым, канешне, трэба падтрымліваць і дзяржаўныя прадпрыемствы. Пытанні аплаты працы на кантролі: заробак павінен выплачвацца своечасова, у поўным памеры, ды і зарплата павінна быць годная.

Пры гэтым **памочнік Прэзідэнта — інспектар па Віцебскай вобласці Анатоль ЛІНЕВІЧ** запатрабаваў, каб рост заработнай платы не апярэджваў прадукцыйнасці працы. Зарплата павінна быць рэальнай, з улікам працаздольнасці кожнага і канчатковых вынікаў.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Малая радзіма

Сэрцам адданыя Дружбе

Маленькая вёсачка Дружба, што ў Быхаўскім раёне, летам схавана ад людскога вока ў зеляніне шматгадовых дрэў. Тут жывуць у асноўным адны пенсіянеры, сэрцам адданыя сваёй маленькай радзіме, зямлі, дзе пачаўся іх лёс. Гэту мясцовасць з такой цёплай назвай ад райцэнтра аддзяляе больш за трыццаць кіламетраў. Па словах старшыні Абідавіцкага сельсавета Алега Шадурына, людзі ў Дружбе вельмі добразычлівыя, працавітыя і сапраўды дружныя. Таму назва мясцовасці цалкам адпавядае рэчаіснасці.

Таццяна Дзмітрыеўна Салохава — адна з самых паважаных жыхароў не толькі вёскі, а і раёна.

Чалавек ганаровы, але пры гэтым вельмі сціплы.

Таццяна Салохава ўвесь час займала актыўную грамадзянскую пазіцыю, шчыра працавала. Была дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР (як і яе матуля), неаднаразова выбіралася ў абласны Савет народных дэпутатаў. Працавала аграномам, брыгадзірам. За сваю плённую дзейнасць узнагароджана ордэнам Леніна, сярэбраным медалём ВДНГ, ордэнам Кастрычніцкай Рэвалюцыі. Мае медаль «Ветэран працы», грамату Вярхоўнага Савета БССР. Некаторыя свае ўзнагароды яна перадала ў абласны музей. Асобнае месца ў яе «скарбонцы дасягненняў» займаюць перыядычныя выданні, дзе было напісана пра Таццяну Салохаву. Самая каштоўная з іх — пажаўцелая ад часу старонка раённай газеты. Тут больш за паўвека назад былі надрукаваны адначасова дзве нататкі пра дачку (Таццяну) і яе маці. (Яны сталі народнымі абраннікамі ў Вярхоўны Савет БССР. Расказвалася пра іх дасягненні ў прафесіі).

— Так, як мы працавалі, напэўна, ужо ніхто не робіць. З раніцы і да позняга вечара, без выхадных. У адпачынак ніколі не хадзіла. Ды што там казаць, нават у дэкрэце пасядзела з малымі ўсяго некалькі месяцаў. Як жа я магла надоўга кінуць сваю брыгаду?! За справу ўсім сэрцам перажывала. Без работы не магу і зараз, — запэўнівае Таццяна Дзмітрыеўна.

Нягледзячы на свой паважаны ўзрост, Таццяна Салохава (а яна ўжо разменяла восьмы дзясятак) разам з мужам Аляксеем Яўменавічам па-ранейшаму садзіць гарод, вырошчвае шмат кветак, трымае гаспадарку). Прачынаюцца яны рана і ўвесь дзень нечым занятыя. Дарэчы, гаспадар таксама быў у ліку перадавікоў у калгасе. Ён — шафёр.

У Быхаўскім раёне Салохавых добра ведаюць і паважаюць. Яны — прыклад для многіх. Выхавалі дзетак, сваімі мудрымі парадамі дзеляцца з унукамі і праўнукамі. І ўсім сэрцам любяць радзіму, асабліва той куточак, дзе яны жывуць.

— Колькі б нас дзеці ні ўгаворвалі пераехаць да іх хоць бы на зіму, мы са сваёй хаты і роднай вёскі нікуды не паедзем. Тут наша малая радзіма. Яе зямля дае нам сілы. Такой Дружбы няма больш нідзе, — запэўніваюць Таццяна Дзмітрыеўна і Аляксей Яўменавіч.

Таццяна МАЛІНІНА, фота аўтара.

ФЕНОМЕН БЛАКІТНАЙ КРЫНІЦЫ

Тут быццам прыпыніўся час. Спакойна, утульна, мірна. Ціха шуміць лес, і пераліваюцца перламутрам на сонцы нябесна-блакітныя хвалі цудадзейнай крыніцы. Дзверы маленькай каплічкі адчынены насцеж. Перад абразамі дрыжаць агеньчыкі свечак. Лікі святых на іконах нібыта ўглядаюцца ў душу. Ад іх пільнага позірку сэрца пачынае трапятаць. Яно ведае: перад гэтымі вачыма не схлусіш.

Ікона ў гонар мужных Макавеяў.

Сёлетняе Макаўе на Блакітнай крыніцы ў Слаўгарадскім раёне было па-асабліваму светлае і размеранае, можна сказаць, камернае. Людзей было, як заўсёды, шмат, але той мітусні і напружанасці, якая прысутнічае, калі нешта робіцца для справаздачы, не адчувалася. Як кажуць тутэйшыя, гэтае свята, нават калі не арганізоўваць, адбудзецца — бо ёсць крыніца, і ў ёй ёсць патрэба. Людзі ідуць да яе са сваімі праблемамі і спадзяваннямі. А яна гасцінна, як маці, сустракае і супакойвае.

Пасля таго як паўтара месяца таму быў адкрыты мост цераз Сож, дабрацца да святога месца стала прасцей. Апроч яго пабудавана шыкоўная часткова бетонная, часткова асфальтавая дарога амаль да самага месца падзей.

14 жніўня праваслаўныя адзначаюць тут памяць пакутнікаў Макавеяў. Тутэйшая капліца — менавіта ў іх гонар, і кожны ахвотны можа купіць ікону з іх выявай. Гісторыя адсылае нас у эпоху яшчэ да Раства Хрыстова, калі ў Сірыі правіў тыранічны цар Антыёх Епіфан. Ён жорстка ўкараняў язычніцкія звычаі і ўсіх прымушаў пакланяцца Зеўсу. Але былі і тыя, хто застаўся верны Богу і верыў у Яго прышэсце, як законавучыцель Елізар з Іерусаліма. Яго асудзілі за гэта на страшныя пакуты. Браты Макавеевы былі вучнямі загінулага і разам са сваёй маці Саламоніяй прызналі сябе паслядоўнікамі Праўдзівага Госпада. Цар Антыёх расправіўся і з імі. Саламонія не змагла перажыць страту сыноў і таксама аддала душу Богу. Гэтыя мужныя людзі зрабілі такое моцнае ўражанне на Юду Макавея, што ён сабраў паўстанне супраць Антыёха і перамог яго. А подзвіг братоў застаўся ў памяці і праз дзясяткі стагоддзяў.

На крыніцы прайшло богаслужэнне ў гонар пакутнікаў і хрэсны ход. Але і на наступны пасля гэтага дзень паломніцтва працягвалася. Пакуль я круціла колы свайго ровара, спрабавала лічыць машыны, якія праносіліся міма. На дваццатай збілася і вырашыла больш не займацца гэтай бессэнсоўнай справай: навошта, калі і так зразумела, што людзей шмат. Вунь і аўтобус паехаў, як потым высветлілася, з турыстамі з Бабруйска.

Кажуць, што патаемнае не трывае мітусні, а малітва просіць цішыні. Славіла сябе на думцы, што каля крыніцы не было ніякага штучнага музычнага фону. Толькі дзіцячы смех, заспакаяльны плёскат вады і ап'яняльны пах мёду.

Нездарма ў народзе першы Спас называюць мядовым. Жніўеньскі мёд спелы, з пахам лугавых і лясных траў, цягучы і празрысты, як смала. А тут яшчэ і асвечаны макавееўскім святам. Мёду на Блакітнай крыніцы сапраўды было багата на любы густ. Прыехала каля 60 пчаляроў з Магілёўскай і Гомельскай абласцей. Выбар вялікі, але цана фіксаваная — літр каштуе 14 рублёў. Сужэнцы са Шклоўскага раёна запэўнівалі, што іх мёд самы натуральны. Жанчына пераварочвала банку, і ўнутры быццам перакочваўся мядовы шар.

На Мядовы Спас сабраліся добрасумленныя пчаляры.

— Бачыце пузыр? Гэта прыкмета таго, што мёд не падробка, — казала яна.

Госці з Рагачова ўразілі разнастайным асартыментам мядовай прадукцыі.

— Гэта ўсё лясное і лугавое разнатраўе — вакол нашай вёскі лес, — усміхалася Алена. — Калгасы не апрацоўваюць гэтыя травы, яны растуць самі па сабе, нічым не атручаныя. Кожная надае смаку сваё адценне. Напрыклад, той, дзе больш скрыпеню, — з кіслінкай.

Звяртаю ўвагу на крэм-мёд: цікава, што гэта за прадукт?

— Гэта той жа мёд, толькі ўзбіты крэмавалкай, — тлумачыць жанчына. — Хоць грэчка, хоць ліпа — ён усё роўна будзе белы. Гэта як з яйкамі, калі іх узбіць як след.

Такі мёд даражэйшы, паўлітра — восем рублёў. Найбольш смачны ён з напаўняльнікамі. Крэм-мёд з жывіцай наогул раяць прымаць як лякарства — чайная лыжка ў дзень, не больш. І рассмоктваць — тут поўны прыродны комплекс вітамінаў. Ёсць крэм-мёд з пяргой, іншымі словамі, пчаліным хлебам — ім пчолкі кормяць сваіх дзяцей. Пчала прыносіць пылок на сваіх задніх лапках, укладвае ў соты, залівае мёдам і апрацоўвае сакрэтнымі залозамі. Такім чынам атрымліваецца пярга.

На вочы трапляе яшчэ адзін незнаёмы прадукт — вадкасць у маленькіх карычневых бутэлечках, якая завецца васковая моль.

— Гэта настойка з лічынак васковай молі, якія харчуюцца пчалапрадуктамі. Кажуць, вылечвае нават сухоты, — рэкламуе гаспадыня.

Насупраць мядовы тавар прапануюць чавускія патомныя пчаляры. На стале — ганаровыя лісты і падзякі за перамогі ў конкурсах. І маркай сваёй тут даражаць.

Гандлёвыя рады, атракцыёны, перасовачныя кавярні… Адных толькі рамеснікаў прыехала каля 80 чалавек. Арганізатары кажуць, што сёлета ўмовы не дазволілі запрасіць расійскіх майстроў. А летась на Макаўе прыязджалі рамеснікі і з расійскіх Хіславіч.

На гадзінніку ўсяго дванаццаць гадзін, а слаўгарадскіх сыраваражу ужо чамусьці не відаць. Аказваецца, наплыў пакупнікоў быў такі, што тавар размялі адразу ж, як яго расклалі.

Камень, які па легендзе кідалі Марка і Сцяпан, каб вырашыць, хто стане абраннікам Кацярыны.

Крычаўская майстрыха Любоў Яшчанка прывезла на свята ўнікальныя свістулькі.

Карункавыя сурвэткі, вырабы з гліны, металу, тэкстылю — можна бясконца любавацца творчасцю ўмелых людзей. Бачу крычаўскую майстрыху Любоў Яшчанку з яе шыкоўнымі керамічнымі свістулькамі. Звычайна яна прыязджае на падобныя мерапрыемствы разам з сужэнцам Вячаславам Якавенкам, але сёння нешта адна. «Ды вось прыхварэў гаспадар, — уздыхае жанчына. — А прапусціць гэта свята я не магла. Яно ж народнае, як і наша творчасць. Акарыны вялікія не павезла, цяжка адной перасоўвацца з такім грузам. А вось свістулькі на любы густ».

Пакуль адны гуляюць у гандлёвых радах, другія напаўняюць свае баклагі вадой і акунаюцца ў блакітныя хвалі гасцінай крыніцы.

Таццяна прыехала з Магілёва з мужам, трыма дзеткамі і свякроўю.

— Мы тут упершыню, — кажа яна. — Шмат чула пра гэтую крыніцу ад сваіх знаёмых, яны сюды пастаянна ездзяць. Вось і мы вырашылі паглядзець, што гэта за месца. Прыехалі — спадабалася. Пахадзілі па вадзе, нават пакупаліся.

Свякроў Людміла Васілеўна дадае:

— Ногі-рукі баляць, спадзяёмся, крынічка нам дапаможа. Мы пра яе даўно ведалі, але даехаць не маглі. А цяпер тут мост пабудавалі, ну, мы і рызыкнулі.

Алена прыехала з Чачэрскага раёна з маці і сынам.

— Другі год прыязджаем, падабаецца, — усміхаецца яна. — І легенды пра гэта месца ведаем — вельмі яны прыгожыя, хоць пра дзяўчыну Кацярыну і яе хлопца крыху сумная. Ад вады ўражанні незвычайныя: калі заходзіш, холадна, а калі выйдзеш — па целе разліваецца незвычайнае цяпло.

У захапленні ад крыніцы і госці з Санкт-Пецярбурга.

— Як вада? — цікаўлюся ў мужчыны, які толькі што выйшаў на бераг.

— Цёпленькая, — смяецца ён.

— Мы тут першы раз, — кажа яго жонка Любоў. — Прыехалі да родных у Чавускі раён, яны і падказалі. Нам вельмі спадабалася. Кажуць, што гэтая вада і хваробы можа вылечыць. Толькі, як кажуць праваслаўныя, па нашай веры будзе нам.

Інга з Рагачова прыехала з мужам і двума дзецьмі.

— Мы не ўпершыню тут, — кажа яна. — І з кожным разам усё лепш і лепш становіцца. Мясціны ўжо не пазнаць. Шмат чаго новага з'явілася.

Колькі чалавек наведала за гэтыя дні Блакітную крыніцу, дакладна ніхто не скажа. Пасля таго як з'явіўся стацыянарны мост цераз Сож, машыны ідуць сюды пастаянна. Але такога, як раней, калі транспарт пад'язджаў амаль да самай крыніцы, няма. Пляцоўка для транспарту знаходзіцца на вельмі значнай адлегласці.

Наогул гэта зона сёння месца рэалізацыі некалькіх міжнародных праектаў.

Макаўе — свята з вялікімі традыцыямі, якія сягаюць у даўнюю эпоху, калі Уладзімір Чырвонае Сонейка хрысціў Русь.

Віталь ВАРАБЕЙ, дырэктар мясцовага фонду развіцця сельскіх тэрыторый «Адраджэннеагра», дэманструе Цэнтр экалогіі крынічнай вады, які цалкам быў здадзены ўсяго паўтара месяца таму. Але яшчэ шмат работы наперадзе.

— Мы рэалізуем праект «Асабліва ахоўныя тэрыторыі як рэсурс экалагічнай адукацыі», — кажа суразмоўца. — У рамках яго на тэрыторыі заказніка «Слаўгарадскі» будуць створаны дзве турыстычныя сцежкі, два веламаршруты, вышкі для назірання за птушкамі. Паралельна вядзецца работа з трыма школамі, ствараюцца экалагічныя класы, якія на тэрыторыі заказніка будуць праводзіць розныя экалагічныя мерапрыемствы. Яшчэ адзін праект «Мост як пілотная бізнес-мадэль для мясцовага і рэгіянальнага эканамічнага развіцця» прадугледжвае стварэнне інфраструктуры на самой Блакітнай крыніцы — гэта тая ж рыначная плошча, якую вы бачыце, Цэнтр экалогіі крынічнай вады, які мы адкрылі. Хутка пачне працаваць Цэнтр сельскага прадпрымальніцтва ў вёсцы Старая Каменка — да яе адсюль восем кіламетраў. Актыўна развіваем турыстычны патэнцыял. Як адкрылі мост, пайшоў людскі паток. Цяпер тут людна кожныя выхадныя. Абавязковы рытуал — тройчы прайсціся па вадзе, прачытаць малітву і прывезці дадому гаючай вады.

Нэлі ЗІГУЛЯ, фота аўтара.
Слаўгарадскі раён.

Вада Блакітнай крыніцы лічыцца цудадзейнай.

Да таго як Уладзімір Чырвонае Сонейка хрысціў Русь, Блакітнай крыніцы пакланяліся язычнікі.

Навасе́лле

ТАКІ НЕАБХОДНЫ І ЧАКАНЫ

Больш не трэба ездзіць у чужы раён: у Гомелі каля мікрараёнаў з інтэнсіўнай жыллёвай забудовай з'явіцца новая дашкольная ўстанова

На вуліцы Крышталеўскай да адкрыцця рыхтуецца «Яслі-сад № 95». Месца яго прапіскі — перапрасшчаны будынак былога дзіцячага дома. Сёлета гэтая нерухомая маёмасць перайшла ва ўласнасць Гомеля. Кіраўніцтва горада прыняло рашэнне адрамантаваць аб'ект і размясціць у ім новы дзіцячы садок: установа дашкольнай адукацыі неабходна маладым сем'ям у гэтым раёне абласнога цэнтра.

Наведваць новы садок змогуць маленькія жыхары мікрараёнаў № 94 і 96. Між тым, паколькі адрамантаваны будынак вялікі, трохпавярховы, тут жа размесцяць паралель першых класаў сярэдняй школы № 15.

Так што, па папярэдніх падліках, пад адным дахам будуць навучацца больш за 250 дзяцей: 75 дашкалят і каля 180 першакласнікаў.

— У гэтым навучальным годзе ў яслях-садзе № 95 пачнуць працаваць чатыры групы: адна для малых ва ўзросце ад двух да трох, дзве для выхаванцаў трох-чатырох гадоў і яшчэ адна — рознаўзроставая. Яе будуць наведваць дзеці ад чатырох да шасці гадоў, — расказала **начальнік аддзела адукацыі, спорту і турызму адміністрацыі Навабеліцкага раёна Гомеля Алена КАПА.** — У далейшым плануем стварыць дадатковую групу.

Да рамонту новага сацыяльна значнага аб'екта прыступілі крыху больш за месяц таму. Тэрміны — рэкордныя. Вызваліся дапамагчы ў рамонце настаўнікі, выхавальнікі і тэхнічны персанал адукацыйных устаноў Навабеліцкага раёна. Для правядзення сантэхнічных і вышынных работ запрасілі спецыялістаў будаўнічых арганізацый.

Пад дзіцячы садок аддадзена тэрыторыя больш чым у паверх. Спальні, памяшканні для заняткаў, гульнявыя зоны, санвузлы — усё адпавядае патрабаванням да дашкольных устаноў. Навучаць і выхоўваць дашкалят будуць 25 супрацоўнікаў, у тым ліку дэфектолаг і псіхолаг.

— На базе гэтай дашкольнай установы мы вырашылі правесці эксперымент, у якім змогуць узяць удзел дзеці старэйшага ўзросту, — дадала Алена Капа. — Як вы ведаеце, звычайна дашкаляты харчуюцца ў сваіх групах. Тут мы паспрабуем вадзіць выхаванцаў у сталоўку, такім чынам сацыялізуючы дзяцей. Але, вядома, у выпадку ўвядзення каранціну вернемся да стандартнай формы арганізацыі харчавання.

Будзе ва ўстанове і яшчэ адна адметнасць. У кожнай групе плануецца зрабіць па дзве спальні, асобна для хлопчыкаў і дзяўчынак. Ужо ў такім узросце ёсць магчымасць праводзіць гендарнае выхаванне, каб фарміраваць мужчынскі і жаночы пачаткі. Дарэчы, такая практыка рэалізуецца пакуль толькі ў садах Навабеліцкага раёна. Першапраходцам у гэтай справе стала ўстанова «Яслі-сад — сярэдняя школа № 73». Цяпер да яе далучыцца і яслі-сад № 95.

Установа пачне працаваць у хуткім часе. У першы тыдзень арганізуюць кароткачасовае знаходжанне дзяцей, пасля чаго садок стане функцыянаваць у поўную сілу.

Завяршаюцца касметычныя рамонтныя работы і ў кабінетах для будучых школьнікаў. На бягучы навучальны год СШ № 15, што ў Навабеліцкім раёне Гомеля, набірае 13 першых класаў. Шэсць з іх размесцяць менавіта тут, на Крышталеўскай.

На тэрыторыі для школьнікаў і дашкольнікаў прадугледжаны чатыры ўчасткі для гульні і адпачынку. Абсталявана спартыўная зона. Асобную пляцоўку зробяць для першакласнікаў з груп падоўжанага дня. З бюджэту на бягучы рамонт і папаўненне матэрыяльна-тэхнічнай базы гэтага сацыяльна значнага аб'екту выдаткавана амаль 40 тысяч рублёў.

Наталля КАПРЫЛЕНКА.
Фота Ганны ПАШЧАНКІ.

Надво́р'е

СПЯКОТА АДСТУПАЕ

Апошнія два дні выдаліся сапраўды гарачыя. На большай частцы тэрыторыі Беларусі слупкі тэрмометраў перавысілі адзнаку 25 градусаў цяпла, а ў панядзелак падабраліся да трыццаці градусаў. І па-ранейшаму няма дажджоў... З аднаго боку, гэта дае магчымасць сабраць ураджай як мага хутчэй, але з іншага, узрастае пажарная небяспека ў экасістэмах. У некаторых раёнах з пачатку месяца не пралілося ніводнай кроплі.

Чаго ж чакаць ад сінаптычнай абстаноўкі на гэтым тыдні? Пра гэта расказалі ў Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

Надвор'е пачне змяняцца ўжо сёння. Да нас з раёна Карпат будзе павольна, але няўхільна перамяшчацца франтальны падзел. Днём у многіх раёнах Брэсцкай, Гродзенскай і Мінскай абласцей пройдуць кароткачасовыя дажджы, месцамі прагрымяць навальніцы. Вецер чакаецца ўсходні і паўднёва-ўсходні, слабы. Але пры навальніцах ён узмоцніцца. Будзе камфортна — ад 21 да 27 градусаў цяпла, а ў Магілёўскай, Гомельскай і месцамі па Брэсцкай вобласці, куды франтальны падзел не дабярэцца, паветра прагрэецца яшчэ больш: да 30 градусаў.

Доўгачаканыя навальнічныя дажджы рознай працягласці і моцы прыйдуць да нас у сераду. Вецер — няўстойлівы, але падчас навальніц ён стане парывістым. Холаду, аднак, не чакаецца: уначы будзе ад 12 да 18 цяпла, удзень — плюс 19—25. На поўдні пры гэтым усё яшчэ будзе трымацца тэмпература да 29 градусаў вышэй за нуль.

Франтальны падзел пакіне тэрыторыю Беларусі ў чацвер. Таму дажджоў прыкметна паменее, а вось тэмпературная «вілка» стане больш адчувальнай. Уначы пахаладае да плюс 10—16, затое ўдзень слупкі тэрмометраў прыбавяць да адзнак у 21—26 градусаў. Ападкі захаваюцца толькі на паўднёвым усходзе, месцамі прагрымяць навальніцы. Там жа чакаецца да +29.

Па папярэдніх прагнозах, канец тыдня пройдзе без дажджоў — на нас пашырыць уплыў чарговы антыцыклон.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

Извещение о проведении 18 сентября 2020 года торгов по продаже имущества, принадлежащего ИООО «ЦЕНТРОБЕТОН»

Предмет торгов
Капитальное строение с инвентарным номером в ЕГРНИ 500/С-22509 общей площадью 241,0 кв. м (наименование: здание мастерской (опалубочной цеха № 7) Б 1/К-П); назначение: здание специализированное иного назначения)
Сведения о земельном участке: площадь – 0,7186 га, кадастровый номер – 500000000005004251, право постоянного пользования
Местонахождение: г. Минск, ул. Железнодорожная, д. 35/3
Начальная цена: 3 212 142,00 бел. руб. с учетом НДС
Сумма задатка: 321 214,20 бел. руб.
Шаг аукциона: 321 214,20 бел. руб.

Продавец имущества: ИООО «ЦЕНТРОБЕТОН», ул. Железнодорожная, д. 35, 220089, г. Минск.

Организатор торгов: государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

Условие торгов: победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, а также возмещает затраты на организацию и проведение торгов в течение 5 дней со дня проведения торгов на расчетный счет организатора торгов.

Торги проводятся в порядке, установленном Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (договор о задатке), внесшие в установленном порядке задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации и подлинник для заверения (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава либо учредительного договора и их подлинники для заверения (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка с отметкой банка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет № BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (единственному участнику аукциона) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (единственным участником аукциона) подписывается в течение 10 календарных дней со дня проведения аукциона и заключается после предъявления копий документов, подтверждающих возмещение затрат на организацию и проведение аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (единственным участником аукциона) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Торги проводятся **18 сентября 2020 года в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 18.08.2020 по 16.09.2020 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. По вопросу ознакомления с продаваемым имуществом следует обращаться по телефону: (029) 615-11-11.

Телефоны для справок:
(017) 327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»); (029) 615-11-11 (ИООО «ЦЕНТРОБЕТОН»).

Уважаемые акционеры
ОАО «МАПИД»

27 августа 2020 года состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «МАПИД», расположенного по адресу: г. Минск, ул. Р. Люксембург, 205.

Собрание созывается по инициативе наблюдательного совета ОАО «МАПИД».

Собрание пройдет по адресу: г. Минск, ул. Р. Люксембург, 205, актовый зал (каб. № 39).

Начало работы собрания – 27 августа 2020 года, 14.00.

Повестка дня:
1. О выплате дивидендов за I полугодие 2020 года.

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться в рабочие дни, начиная с 19 августа по 26 августа 2020 года по месту нахождения Общества: г. Минск, ул. Р. Люксембург, 205, каб. № 208А (производственный отдел собственного строительства УКС) с 9.00 до 16.00, 27 августа 2020 года – по месту проведения собрания с 9.00 до 12.30.

Список лиц, имеющих право на участие в собрании акционеров, будет составлен на основании реестра акционеров, сформированного на 17 августа 2020 года.

Регистрация участников собрания с 12.30 до 13.30 по месту проведения собрания.

Для регистрации при себе иметь следующие документы:
- акционеру общества – паспорт;
- представителю акционера – паспорт и доверенность.

Администрация.

УНП 100008115

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению Республиканского унитарного предприятия «Минскавтодор-Центр» (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже

изолированного помещения конторы

(линейной дорожной дистанции № 662 филиала «ДЭУ № 66»)
с инвентарным номером 633/D-5080 общей площадью 55,9 кв. м, расположенного в здании блокированного жилого дома с инвентарным номером 633/С-6694 по адресу: Минская область, Мядельский район, г. п. Свирь, ул. Советская, 14-4 (далее – Объект).

Начальная цена без НДС – 2 200,00 бел. руб.
Цена снижена на 80 %.
Задаток 10 % от начальной цены – **220,00** бел. руб.

Задаток перечисляется на р/с BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов (конкурсов) по продаже отдельных объектов, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 609 (далее – Положение 609).

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) календарных дней с даты заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Организатор торгов имеет право отказаться от их проведения: в любое время, но не позднее чем за три дня до наступления даты проведения аукциона.

Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (покупатель) в течение 3 (трех) рабочих дней со дня их проведения. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в Положении 609, размещенном на сайте организатора торгов www.rit.by. Предыдущие извещения были опубликованы в газете «Звязда» от 12.11.2019, 24.06.2020, 21.07.2020. Аукцион состоится **02.09.2020** в **14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **01.09.2020** до **16.00** по указанному адресу.

Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17.

УНН 190638747

Журналіст даследуе праблему

Лёс прыватнага дома

У зоне перспектыўнай забудовы

Карэспандэнт «Звязды» высвятляла падрабязнасці жыллёвай калізіі, у якую трапіла жыхарка Горак.

«Добры дзень, — напісаў у звароце ў рэдакцыю сын гэтай жанчыны. — Так атрымалася, што я знаходжуся за мяжой, а маю маці, пенсіянерку, у гэты час выселяюць з дома, які будавалі яшчэ мае прадзед і дзед. Ёй не хочуць ацэньваць дом каля 100 квадратных метраў, лазню, гаспадарчыя пабудовы, уласную краму плошчай 45 квадратных метраў, сад з пладовымі дрэвамі і кустоўем... Замест усяго гэтага прапануюць двухпакаёўку на апошнім паверсе шматпавярховіка. Яна звярталася ва ўсе інстанцыі, каб адстаяць свае правы, але безвынікова». І прыклаў да паслання ліст ад маці на дзевяці старонках.

У Марыі Сяргееўны шмат афіцыйнай дакументацыі.

РАШЭННЕ НА ЗНОС

Цагляны дом **Марыі ВАЛЕНЦІЙ** у Горках шукаць доўга не давялося: ён вельмі зручна размясціўся, лічы, у самым цэнтры горада — непадалёк ад райвыканкама і аўтавакзала. Як расказала Марыя Валенцій, усё пачалося ў лістападзе 2018 года, калі да яе прыйшла прадстаўніца раённага агенцтва па нерухомасці і зямельным кадастры, каб апісаць маёмасць. Яна паведаміла, што дом знаходзіцца ў зоне перспектыўнай забудовы і, згодна з рашэннем Горацкага райвыканкама, яшчэ ў 2009 годзе быў прызначаны пад знос. Для Марыі Сяргееўны гэтая заява стала, мякка кажучы, нечаканай. Жанчына вырашыла аспрэчыць рашэнне выканкама аб зносе дома. Але ні Горацкі суд, ні Магілёўскі абласны, куды яна напісала апеляцыю, не задаволілі яе патрабаванні. А ў чэрвені ў Горках па справе Валенцій адбыўся яшчэ адзін суд, пасля якога жанчына атрымала прадпісанне на перасяленне. Ёй прапануюць тэрмінова пераехаць з прасторнага прыватнага дома ў сціплую двухпакаёўку.

НЯЎЛІЧАНЫЯ МЕТРЫ

Да размовы з карэспандэнтам гаспадыня падрыхтавала цэлы стос афіцыйных папер з дазволамі, тэхнічнай дакументацыяй, перапіскай з райвыканкамам за апошнія паўтара года, рашэннямі судоў. Жанчына паказвае ўсё гэта і плача. Кажа, што для яе перасяленне — вялікі стрэс. Гэта ж дом яе продкаў, пабудаваны з любоўю. А пачынаць жыццё на новым месцы, калі ты вырас тут і пражыў амаль 60 гадоў, балюча. Яшчэ больш яе абурае, як праводзілася ацэнка нерухомасці.

— Ацэньвалі, лічы, «на вока», казалі, што гэта робіцца для вызначэння прыблізных затрат, якія трэба ўключыць у бюджэт раёна, — расказвае жанчына. — Па той ацэнцы, дом з выгодамі агульнай плошчай 90 квадратных метраў у самым цэнтры горада, з садам, дваром, лазняй, гаспадарчымі пабудовамі і крамай каштуе ўсяго... 25 тысяч долараў. Палову дома насупраць чатыры гады таму купілі за 16 тысяч долараў, дык там ні вады, ні газу, ні каналізацыі.



Рашэнне райвыканкама ад 2009 года, дзе пазначаны дамы, якія пойдуць пад знос.

Між тым высвятляецца, што дом у Марыі Сяргееўны дэ-факта адных памераў, а дэ-юра — зусім іншых. Фактычна яго плошча 90 квадратных метраў, але ў Агенцтве па нерухомасці і зямельным кадастры юрыдычна афармлена нашмат менш.

У спіс нерухомасці, за якую прадугледжана кампенсацыя, не ўвайшла таксама крама плошчай болей за 40 «квадратаў», якую сямейства Валенцій пабудавала ў пачатку 2000-х. Гаспадыня падрабязна расказвае, як атрымалі дазвол, як будавалі, як гандлявалі. Запэўнівае, што ўсё было афармлена па правілах, і дэманструе асобную папку па краме — з праектамі на электрычнасць, зазямленне, іншымі дазволамі, экспертызамі і плацёжкамі. Пры гэтым не хавае, што ёсць адно «але».

— Крама існавала з 2004 года, але я нават не ведала, што на яе не было тэхпашпарта, — прызнаецца жанчына. — Даведалася пра гэта ўжо пасля смерці маці, калі ўступіла ў спадчыну. Спрабавала ў 2016 годзе зарэгістраваць пабудову і аформіць пад яе зямлю ў арэнду на 30 гадоў, але сума была непад'ёмная. На растэрміноўку ў райвыканкаме не пагадзіліся, і я пакінула ўсё як было.

У выніку гаспадыні вялікага дома прапанавалі зрабіць выбар. Тут таксама не абышлося без праблем. Згодна з Указам Прэзідэнта № 58, Марыя Валенцій можа прэтэндаваць на кватэру, або грашовую кампенсацыю, або будаўніцтва новага аднапавярховага дома, або «пераезд» таго, што ўжо ёсць, у іншае месца. Да кожнага з варыянтаў жанчына мае прэтэнзіі. Кампенсацыя, якую ёй прапанавалі за дом, малая: за 25 тысяч долараў у Горках нешта раўнацэннае купіць немагчыма. Будаваць новы дом на новым месцы яна таксама адмовілася — растлумачыла, што тыя ўчасткі, дзе дазволена ўзводзіць жыллё, знаходзяцца на ўскрайку горада. Можна было б пераехаць у іншае месца з ужо існуючым домам, але зноў такі прапануюць толькі перыферыю. Ад кватэры жанчына адразу ж катэгарычна адмовілася, бо не ўяўляе сябе ў іншым месцы, акрамя прыватнага дома. У роспачы яна падпісала пратакол рознагалоссяў, які ёй прапанавалі ў райвыканкаме, афіцыйна заверыўшы сваю пазіцыю, — ніводны з варыянтаў не задавальняе. У выніку мясцовая ўлада зрабіла выбар за яе — выдзеліла двухпакаёўку агульнай плошчай 58 «квадратаў» у пяціпавярховіку на той жа вуліцы Калініна, дзе яна жыве: нумар яе цяперашняга дома 21, а новага — 31. Новабудоўля была здадзена ў эксплуатацыю ў студзені гэтага года.

Дом, у які прапануюць пераехаць Марыі ВАЛЕНЦІЙ.

ПОГЛЯД З ІНШАГА БОКУ

У Горацкім райвыканкаме запэўніваюць, што парушэнняў правоў грамадзянкі Марыі Валенцій няма і тое, што яе не папярэдзілі пра знос 11 гадоў таму, законна.

— Генплан — гэта перспектыўны дакумент. Мы можам пачаць будаўніцтва заўтра, паслязаўтра, а можам праз 30 гадоў, — кажа **намеснік старшыні Горацкага райвыканкама па жыллёва-камунальнай гаспадарцы, будаўніцтве і архітэктуры Андрэй КАМКО.** — Ёсць дэталёвы план забудовы, ёсць заданне ўрада і аблвыканкама па ўводзе агульнай плошчы жылля, якое даводзіцца да райвыканкама. Выходзячы з гэтага, мы фарміруем сваю гадавую праграму. Пралічваем, колькі будзе пабудавана індывідуальнага і шматкватэрнага жылля на вольных участках. Сёння мы будуем дамы за кошт ушчыльнення існуючай жылой забудовы або зносу індывідуальных жылых дамоў. У студзені мінулага года на месцы дома грамадзянкі было запланавана пабудаваць пяціпавярховік.

А ў тым, што агульная ацэнка дома Марыі Валенцій у грашовым эквіваленце атрымалася сціплая, жанчына сама вінаватая, лічыць Андрэй Камко. Трэба было своечасова ўзаконьваць свае метры і змяненні, тады б і пытанняў не ўзнікала. Мясцовыя ўлады некалькі разоў прыцягвалі Марыю Валенцій да адміністрацыйнай адказнасці за самабуд.

— Крама наогул пабудавана з парушэннямі, — адзначае **Таццяна БАЛОЖКА, намеснік начальніка ўпраўлення землеўпарадкавання Горацкага райвыканкама.** — Маці Марыі Валенцій далі ўчастак для абслугоўвання дома, а не крамы. Спадчыніца не зарэгістравала правы ні на краму, ні на зямлю. Іншымі словамі, Калі ўжо зроблены нейкія змяненні, трэба ісці ў райвыканкам і ўзаконьваць, а не чакаць, калі гром грымне. Мы спецыяльна ходзім па горадзе, каб выявіць факты самавольнага будаўніцтва, але да кожнага не завітаеш. А вось у такіх сітуацыях усё і выплывае на паверхню.

Дом з крамай, што павінны пайсці пад знос.

АФІЦЫЙНА

Як растлумачылі ў Камітэце па архітэктуры і будаўніцтве Магілёўскага аблвыканкама, дэталёвы план паўднёва-ўсходняга раёна ў горадзе Горкі зацверджаны ў 2009 годзе ў адпаведнасці з дзеючым на той час заканадаўствам. У адпаведнасці з рашэннем Горацкага райвыканкама ад 21 студзеня 2019 года № 2-21, шэраг зямельных участкаў, у тым ліку і ўчастак Марыі Валенцій па вуліцы Калініна, 21, падлягае перадачы для дзяржаўных патрэб у сувязі з запланаваным будаўніцтвам шматкватэрнага жылога дома. Грамадскае абмеркаванне не праводзілася, таму што аб'ект прадугледжаны горадабудаўнічай дакументацыяй. Грамадзяне, зямельныя ўчасткі якіх падлягаюць перадачы для дзяржаўных патрэб, былі апавешчаныя ў адпаведнасці з Палажэннем аб парадку рэалізацыі маёмасных правоў грамадзян і арганізацый пры канфіскацыі ў іх зямельных участкаў. Вышэйназванае рашэнне накіравана заяўніку Горацкім райвыканкамам 23 студзеня 2019 года. У сувязі з тым, што Марыя Валенцій ад усіх прапанаваных варыянтаў рэалізацыі яе правоў адмовілася, Упраўленнем капітальнага будаўніцтва Горацкага раёна на адрас Марыі Валенцій накіраваны ліст з паведамленнем аб выдзяленні ёй двухпакаёвай кватэры тыпавых спажывецкіх якасцяў на пятым паверсе ў шматкватэрным жылым доме, уведзеным у эксплуатацыю ў сакавіку бягучага года.

P.S.

Справа з перасяленнем Марыі Валенцій пакуль застаецца адкрытая. Як паведаміў дырэктар Горацкага УКБ Максім Быкаў, жанчына не прызнала рашэнне Горацкага суда і абскардзіла яго ў Магілёўскім абласным судзе. Пакуль канчатковае рашэнне не прынятае. Адпаведна, будаўніцтва жылога шматпавярховага дома па гэтым адрасе таксама зацягваецца.

Нэлі ЗІГУЛЯ, фота аўтара.

❍ Кампетэнтна

Генадзь МІХАЛАП, адвакат Магілёўскай абласной калегіі адвакатаў:

— Калі чалавек уступае ў спадчыну, натарыус выдае яму пасведчанне аб праве на спадчыну. Яго трэба зарэгістраваць у Агенцтве па нерухомасці і зямельным кадастры. У пасведчанні даецца поўная інфармацыя і па метражы дома, і па прыбудовах, і па зямельным участку, які стаў аб'ектам спадчыны. Калі ніхто з папярэднікаў не праводзіў адпаведную тэхнічную рэгістрацыю змяненняў дома, разлічваць на поўную яго ацэнку не даводзіцца. Заканадаўства прадугледжвае, што трэба рабіць, калі ты хочаш прыбудаваць лазню або веранду, пашырыць дом. І калі чалавек робіць выгляд, што нічога не ведаў пра неабходнасць рэгістрацыі, гэта не вызваляе яго ад адказнасці. Калі на ўчастку, які быў прадстаўлены для будаўніцтва жылога дома, зрабілі яшчэ нешта, гэта будзе лічыцца самавольным будаўніцтвам. У Агенцтве па нерухомасці і зямельным кадастры можна ўдакладніць, што з пабудаванага законна, а што не. Самавольныя пабудовы ніхто ацэньваць не будзе. Усю інвентарызацыю, каб нешта аблічыць і выплаціць, робяць на падставе тэхнічных дакументаў, якія знаходзяцца ў Агенцтве па нерухомасці і зямельным кадастры. Толькі яны маюць юрыдычна значны характар і могуць вызначаць, што з'яўляецца законным. Усё астатняе незаконна.

ЧАЛАВЕК СВЕТУ З КАБЫЛЬНІКУ

Норман Нароцкі прайшоў адзін з найдаўжэйшых шляхоў у мастацтве

1907 год, Кабыльнік — мястэчка на скрыжаванні шляхоў у Полацк, Вільню, Мінск і Дзвінск. Тут ёсць касцёл, царква, сінагога, багадзельня, народнае вучылішча, карчма, млын, вінакурня і рыбныя сажалкі. За год праходзіць некалькі кірмашоў, рэгулярна працуе базар. Выгаднае геаграфічнае становішча дазваляла месцічам займацца гандлем, але з той жа прычыны многія войны і паўстанні закраналі Кабыльнік. За пяцьсот гадоў існавання ён неаднаразова гарэў, але адбудоўваўся і жыве і сёння (цяпер гэта вёска Нарач. — «Зв».).



На пачатку XX стагоддзя на сельніцтва мястэчка складала каля тысячы жыхароў, з іх амаль палова — яўрэі. У гэты перыяд адбывалася хваля міграцыі еўрапейцаў, у тым ліку падданых Расійскай імперыі, у Амерыку. Шаснаццацігадовы Аарон, сын мясцовага яўрэя, кабыльняцкага рыбака і краўца Давіда Нароцкага, таксама адправіўся ў Новы свет шукаць лепшага лёсу. Яўрэі часам атрымлівалі прозвішчы згодна з мясцовасцю, у якой яны жылі — Свірскі, Крывіцкі, Нароцкі і г. д., так і прозвішча Нароцкіх было звязана з возерам Нарач, бліз якога размешчана мястэчка.

Аарон распачаў новае жыццё ў ЗША. Як і бацька, ён працаваў краўцом, праз некаторы час ажаніўся з мігранткай з Украіны, і ў іх нарадзілася двое дзяцей. У 1930—1940-я гады Нароцкі стаў адным з заснавальнікаў Таварыства дапамогі Кабыльніку, члены якога аказвалі грашовую дапамогу жыхарам мястэчка. Пасля вайны цэнтр згуртавання эмігрантаў — яўрэяў з Кабыльніка і Мядзела існаваў у Ізраілі. Удзельнікі згуртавання праводзілі работу па ўшанаванні ахвяр вайны, уладкавалі яўрэйскі могільнік у Кабыльніку і выдалі збор успамінаў кожнага сведкі вайны са згуртавання.

Старэйшы сын Аарона, Норман (Norman Narotzky), нарадзіўся ў 1928 годзе ў Нью-Ёрку. Сёння гэта слынны амерыканскі і іспанскі мастак, які жыве ў Барселоне. Норман Нароцкі правёў каля шасцідзесяці персанальных і мноства калектыўных выставак у прэстыжных музеях і галерэях Іспаніі, Францыі, Бельгіі, Германіі, Англіі, Партугаліі, ЗША. Яго работы захоўваюцца ў Музеі мастацтва Філадэльфіі, Мастацкай галерыі Мілс каледжа ў Каліфорніі, Музеі мастацтва Цынцынаці, Музеі Ставанджэра ў Нарвегіі, Цэнтры мастацтваў Каралевы Сафіі ў Мадрыдзе, Нацыянальным мастацкім музеі Каталоніі ў Барселоне, Музеі сучаснага мастацтва ў Вілафармэс і ў іншых музеях і прыватных калекцыях.

Мы сустрэліся са спадаром Нароцкім у Барселоне — два чалавекі, аб'яднаныя любоўю да мастацтва і беларускімі каранямі, — і ён расказаў пра сваё жыццё і творчы шлях.

...Схільнасць да маляванне Норман праяўляў ужо з пяцігадовага ўзросту, а ў трынаццаць гадоў распачаў навучанне ў школе музыкі і мастацтва ў Нью-Ёрку. Затым паступіў у Бруклінскі каледж з мастацкім ухілам, які скончыў з тытулам бакалаўра мастацтва cum laude. У 1949 годзе Норман паспяхова прайшоў конкурс у адну з найбольш славутых навучальных устаноў ЗША Купер Юніан. Яе выпускнікі адзначаны прэстыжнымі міжнароднымі прэміямі, уключаючы Нобелеўскую і Прытцкераўскую. Дзеля таго, каб пракарміць сябе, Норман удзень працаваў у студыі графічнага дызайну, а па вечарах вучыўся.

У 1953 годзе Нормана прызвалі ў армію. Якраз ішла вайна паміж Паўночнай і Паўднёвай Карэямі, і ён меў усе шанцы аказацца ў віры ваеннага канфлікту, але, напэўна, як і бацька, быў народжаны пад шчаслівай зоркай: мастака адправілі служыць у армейскую часць у Тэхасе, размеркавалі ў дэпартамент графічнага мастацтва, дзе ён маляваў ілюстрацыі для дапаможнікаў секцыі медыцынскай падрыхтоўкі. Па заканчэнні службы Норман падаў заяўку на стыпендыю на вучобу ў Парыжы і выйграў яе. Сярод знаёмых Нормана яго пераезд у Еўропу выклікаў здзіўленне, бо хваля міграцыі якраз ішла ў адваротным напрамку. Затым ён атрымаў грант праграмы ЗША па культурным абмене з іншымі краінамі і пераехаў у Мюнхен, дзе ўдасканальваў майстэрства ў Акадэміі мастацтваў, дадаткова прайшоў курс у галіне выяўленчых мастацтваў у Нью-Ёркскім універсітэце і такім чынам завяршыў амаль дваццацігадовы (!) перыяд адукацыі. З таго часу Норман Нароцкі бесперапынна займаецца творчасцю.

У 50-я гады Нароцкі наведаў Кадакес, прыбярэжны каталонскі горад. Яго настолькі ўразілі пейзажы Каталоніі, што ён застаўся працаваць на цэлае лета, а з 1958 года пасяліўся ў Барселоне назаўсёды. Мастак ажаніўся з дзяўчынай родам з Каталоніі, пара выхавала дзвюх дачок, адна атрымала адукацыю антраполага, другая — прамысловага дызайнера і гісторыка.

Дзед мастака Давід Нароцкі с дзецьмі.

Асноўны від творчасці, якім займаецца Нароцкі, — жывапіс, хоць некаторы час ён прысвяціў графіцы, гравюры і скульптуры. Па кірунках і стылю работы мастака ўкладваюцца ў азначэнні ад абстракцыянізму да фігуратыўнага жывапісу.

У перыяд творчага і асабістага сталення да Нормана прыходзяць развагі аб духоўнай эвалюцыі чалавецтва. Ён стварае карціны з выявамі Аўраама Лінкальна і Марціна Лютэра Кінга, у якіх гучыць асуджэнне расізму. Крыху пазней роздумы над апошнімі 500 гадамі заходняга свету былі прадстаўлены ў работах «Каталіцкія каралі», дзе выкрываліся расавы, рэлігійны і палітычны пераслед паўсюль і на працягу гісторыі, пачынаючы з часоў іспанскай інквізіцыі як зыходнага пункта. У 1967 годзе «Каталіцкія каралі» былі прадстаўлены ў галерэі Рэнэ Метрас. Толькі падчас выстаўкі разгледзелі, што, акрамя маштабнай выявы караля Фердынанда і каралевы Ізабэлы, палотны насычаны дробнымі недвухсэнсоўнымі дэталямі і калажамі, сярод іх выявы Гітлера, атрад ККК, сімвалы ганення і смерці.

Калі ўладам стаў вядомы сюжэт карцін мастака, выстаўка ўжо завяршылася. Гэта выклікала скандал у франкіцскай Іспаніі. Прадстаўніка міністэрства інфармацыі і турызму тэрмінова накіравалі ў студыю Нормана на праверку карцін. Сталічны мастацвазнаўца папярэдне пісаў вельмі добразычлівую крытыку на работы Нормана. З гэтага часу, аднак, тон эксперта рэзка змяніўся. Ён пачаў друкаваць агрэсіўныя водгукі на жывапіс Нормана, выступаў з асуджальнымі прамовамі, а таксама ўплываў на іншых крытыкаў з мэтай прадухіліць выпуск любых рэцэнзій на творы мастака. Яшчэ на працягу некалькіх гадоў да Нормана на выстаўкі прыходзілі сакрэтныя чыноўнікі, каб пераканацца, што там не ўтрымліваецца нічога абразлівага для ўрада. Мастак мяркуе, што ўсё ішло да яго дэпартацыі з Іспаніі, і толькі шлюб з грамадзянкай Іспаніі дапамог яму застацца ў краіне.

У 1970-я гады Нароцкі піша серыю карцін «Выявы жыцця і смерці» з нагоды вайны ў В'етнаме, як пратэст супраць усіх войнаў і гвалту. У ёй вобразы рыцараў у ваенных даспехах супрацьпастаўляліся выявам жаночых формаў, як сімвалам крыніцы жыцця і кахання. Адтуль мастак перайшоў да серыі «Жывы ландшафт», дзе маляваў горы Мансэрат, а таксама ўзбярэжжа і горы Коста-Бравы ў выглядзе жывых формаў. Затым Норман прыняўся за напісанне ўрбаністычных пейзажаў, спачатку Барселоны, а затым і Нью-Ёрка.

Апошняя серыя карцін мастака «Заход сонца» — гэта закладзенае ў фарбы і формы папярэджанне чалавецтву аб крохкасці існавання і пагрозе самазнішчэння праз войны, тэрарызм і пастаянную шкоду зямлі і навакольнаму асяроддзю. Гармонія жыццесцвярджальнай атмасферы карцін, перададзеная чыстымі насычанымі колерамі, руйнуецца прысутнасцю змрочных вобразаў знішчэння і скону.

Пайшоўшы адзін з найдаўжэйшых шляхоў у мастацтве, Норман добра ведае ўсе плюсы і мінусы прафесіі мастака. Пазітыўныя моманты заключаюцца ў магчымасці рабіць тое, што падабаецца, выражаць сябе і ствараць нешта асабістае — эмацыянальна гэта вельмі задавальняючы працэс. Але мінус прафесіі ў тым, што гэта непрыбытковы бізнес, за нешматлікімі выключэннямі.

...З пункту гледжання Нормана, недастаткова проста размясціць аб'ект у музеі, каб назваць яго творам мастацтва. Перадусім ён мусіць мець структуру, перадаваць эмоцыі і канцэпцыю. Куча пяску ў музеі не ёсць мастацтва, калі яна не насыпана так, каб быць выяўленча прыгожай, структураванай, экспрэсіўнай і трансліраваць перажыванні аўтара.

Неабходнай умовай творчага прагрэсу мастак лічыць настойлівую штодзённую працу. «Я не чакаю натхнення ці добрага настрою, — кажа ён. — Калі вы чакаеце натхнення, у выніку вы не атрымаеце нічога. Натхненне прыходзіць у працэсе. Часам у мяне ёсць уяўленне таго, што я хачу пісаць, часам не. Але калі я не ўпэўнены, ідэі падштурхоўваюцца самой работай: першая каляровая пляма на палатне прадказвае наступную, і паступова вы пачынаеце больш выразна бачыць, куды ісці». Немагчыма падтрымліваць працоўны рытм на адным узроўні ў маладосці і сталасці, але і на дзясятай дэкадзе жыцця майстар стараецца аддаваць жывапісу кожны дзень, за выключэннем выхадных.

Мастаку так і не давялося пабываць у Кабыльніку, але яго дачка падчас распаду СССР наведала месца жыцця сваіх продкаў.

Сёння мастаку 92 гады. Паважанага ўзросту ён дасягнуў, дзякуючы перш за ўсё добрай генетыцы, а таксама стрыманаму ладу жыцця і адсутнасці шкодных звычак. Норман лічыць: для таго, каб у рэтраспектыве быць задаволеным сваім жыццём, неабходна заўсёды выкладвацца з усіх сіл, што б ты ні рабіў.

Іна БЕРНЯКОВІЧ, Барселона.

Даведка «Звязды»

Іна Берняковіч — наша землячка, ураджэнка Мядзельшчыны, якая ўжо доўгі час жыве і працуе ў Іспаніі. Па прафесіі яна генны інжынер, мае адпаведную вучоную ступень, але навуковыя інтарэсы не замінаюць Іне шчыра цікавіцца мастацтвам, а таксама краязнаўствам. Праз пошукі ў інтэрнэце яна і выйшла на героя свайго артыкула, з якім пазнаёмілася завочна, а потым і асабіста на выстаўцы ў Барселоне.

Беларусь незвычайная

І БАЛІ, І МАЛІ, І НОВАЯ ЗЯМЛЯ

Сям'я фатографаў праклала маршрут па беларускім «замежжы»

Аказалася, што ў нашай краіне існуюць некалькі дзясяткаў населеных пунктаў, якія маюць сваіх цёзак на сусветнай геаграфічнай карце. Каб іх праехаць усе, сям'і спатрэбіўся амаль тыдзень. Вынікам паездкі сталі сотні фотаздымкаў, частка якіх увайшла ў экспазіцыю выстаўкі, што днямі адкрылася ў Гродне.

Сяргей і Наталля МАРОЗАВЫ — прафесійныя фатографы, якія вельмі любяць вандраваць. Заўсёды падчас адпачынку выбіраюцца ў творчае падарожжа. Напрыклад, летась падарожнічалі па Грузіі, а перад гэтым здзейснілі вандроўку ажно на Алтай. Сёлета таксама меркавалі адправіцца за мяжу, але з-за пандэміі перагледзелі планы. Сталі шукаць «замежны» акцэнт у Беларусі. І ўбачылі, што на геаграфічнай карце нашай краіны нямала назваў, якія маюць вядомыя аналагі за мяжой. Не разважаючы доўга, узялі дзяцей і без усялякіх візаў адправіліся ў Літву, Манголію і нават у Палесціну.

— Па праўдзе, ідэя ажыццявіць такое падарожжа па Беларусі ў нас была даўно, — прызнаецца Сяргей Марозаў. — І вось нарэшце сёлета нам удалося здзейсніць свае планы і праехаць Беларусь уздоўж і ўпоперак у пошуках населеных пунктаў з замежнымі назвамі. Дарэчы, некаторыя з іх нават не маюць шыльдаў, але мы ўсё роўна іх знайшлі.

Многія мясціны, такія, як Парыж, Балі, Малі даволі часта на слыху, але аказалася, што ў Беларусі нямала назваў, якія не так вядомы. Напрыклад, Каўказ, Дублін, Місуры, Дубай.

— Я адкрыў спіс населеных пунктаў Беларусі, і аказалася, што ён няпоўны. Яшчэ штосьці знаходзілі падчас вандроўкі. Калі потым падсумавалі, аказалася, што такіх «замежных» аналагаў больш за трыццаць. Гэта і аграгарадкі і маленькія вёсачкі. Быў складзены маршрут працягласцю 3,5 тысячы кіламетраў. Наша падарожжа заняло шэсць дзён, — расказаў суразмоўнік.

Большасць вёсак аказаліся зусім маленькія. Напрыклад, у Балі можна налічыць да дзясятка дамоў, з якіх палова ўжо нежылыя. Ці Манголія, дзе зараз, па словах Сяргея, можа, адзін-два дамы заселены, яшчэ адзін пусты. Калі глядзець зверху, бачна, што вёска раней была вялікая, але цяпер там поле.

Сяргей — прафесійны фатограф, дацэнт кафедры журналістыкі Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Я. Купалы, мае сваю ўласную фоташколу. Намінант і лаўрэат многіх рэспубліканскіх і міжнародных фотаконкурсаў, член фотаклуба «Гродна». Аўтар 50 персанальных выставак у Беларусі, Літве, Расіі. Ён лічыць, што сапраўдны здымак павінен быць «жывы», ён павінен адлюстроўваць альбо выклікаць эмоцыі.

Са сваёй жонкай Наталляй пазнаёміўся менавіта на глебе агульных інтарэсаў. Цяпер ствараюць сумесныя творчыя праекты. «Геаграфічны парадокс» — адзін з іх.

Вось на здымку знакаміты Парыж, які знаходзіцца ў Віцебскай вобласці. Аб ім нямала напісана, бо тут нават стаіць Эйфелева вежа ў мініяцюры. Гэта ініцыятыва мясцовага святара, таму вежа ўвянчаная крыжам. На краме вялікая шыльда з надпісам «Парыж». Ёсць здымкі з Косава, Палесціны, Сахаліна, Новай Зямлі, што знаходзіцца на мяжы з Расіяй. Ёсць нават Місуры, што незвычайна для нашых мясцін. А вось населеных пунктаў з назвай Беларусь вандроўнікі сустрэлі нават два — у Мінскай і Віцебскай абласцях.

«Замежныя» назвы — не адзінае, што захапіла Марозавых. Напрыклад, у Наталлі быў свой творчы багаж з цікавымі назвамі. Сюды ўвайшлі планеты Сонечнай сістэмы, такія як Марс, Юпітэр, Нептун, Венера. Ёсць у яе здымкі з Рая. І сапраўды, у вёсцы знайшлі дамы з даволі экзатычным выглядам, здаецца, што бабуля, якая сядзіць на лаўцы, знаходзіцца ў такім вось райскім куточку.

— З тых жыхароў, што сустракаліся падчас вандроўкі, мала хто мог растлумачыць, адкуль з'явілася тая ці іншая назва, — кажа Наталля. — Але ёсць меркаванне, што мясцовыя ўладары некаторых сядзібаў захапляліся рымскай міфалогіяй, адсюль і назвы вёсак-планет. Прычым, Марсы нават два.

У свой маршрут Марозавы ўключылі і Харошае, і Глыбокае, і Горы, і Канаву, і Новае Жыццё, і Радасць... Усяго ў маршруце аказалася каля 70 населеных пунктаў. Каб здзейсніць задумку, прыйшлося ў дзень праехаць больш за 10 вёсак і аграгарадкоў. Многія здымкі зроблены з вышыні птушынага палёту. У гэты час наваколле асабліва прыгожае, таму здымкі-пейзажы выглядаюць даволі маляўніча. Трапляюцца і вельмі цікавыя аб'екты, напрыклад, возера амаль круглай формы. І ў цэнтры такі ж круглы востраў.

А вось што ўспамінаецца без энтузіязму, дык гэта дарогі. Даволі працяглыя ўчасткі аказваліся гравійнымі ці нават пясчанымі. Бывала, што такі ўчастак цягнецца на 30—40 кіламетраў. Таксама не ўсюды ўдавалася смачна паесці — мясцовыя кафэ не маглі прапанаваць разнастайны асартымент. Пры ўсім пры тым, падарожжам Марозавы задаволеныя. Па-першае, удалося больш дасканала паглядзець беларускія прасторы, па-другое, зрабіць здымкі населеных пунктаў з цікавымі і «замежнымі» назвамі. А многія, на жаль, знікаюць...

Па словах арганізатара выстаўкі, старшыні фотаклуба «Гродна» Аляксандра Ласмінскага, аўтары паказалі Беларусь у незвычайным ракурсе. Гэта новая тэма і ў турыстычным кірунку, бо такога цэласнага маршруту пакуль няма. А чаму б не праехаць па дарозе з «геаграфічнымі парадоксамі»?

— Аказалася, што вядомая частка замежжа знаходзіцца на тэрыторыі Беларусі. Пакуль гэта толькі фотападарожжа, але, на маю думку, знойдзецца нямала ахвотнікаў праехаць па турыстычным маршруце, які б прывёў і ў Парыж, і ў Дубай, пабываць на Каўказе, Сахаліне, у Манголіі, апынуцца на Марсе ці Венеры, — упэнены старшыня фотаклуба. — Вядома мала арганізаваць проста турыстычны маршрут, трэба прыдаць гэтым населеным пунктам адпаведны змест. Таму што для турыста важна не толькі назва, але і магчымасць нешта ўбачыць, скарыстацца турыстычнай інфраструктурай. Гэта той рэзерв нашага турыстычнага патэнцыялу, які пакуль ніяк не выкарыстоўваецца.

Па словах Аляксандра Ласмінскага, трэба ствараць больш умоў для папулярызацыі нашай краіны прафесійнымі фатографамі. Напрыклад, у Польшчы часта праводзяцца спецыяльныя фотапленэры, прычым міжнародныя, устаноўлены пляцоўкі, якія адкрываюць маляўнічыя краявіды. Адтуль могуць рабіць здымкі як звычайныя турысты, так і прафесійныя фатографы. Усё гэта працуе на імідж краіны, сцвярджае старшыня фотаклуба і журналіст. Дарэчы Сяргей Марозаў плануе наступны свой праект прысвяціць замкам Беларусі, прычым тым, якія пакуль не вельмі вядомыя і патрабуюць рэканструкцыі. Большасць здымкаў, як і ў праекце «геаграфічнага парадоксу», будзе зроблена з дапамогай квадракоптара.

Маргарыта УШКЕВІЧ.
Фота дадзена Сяргеем МАРОЗАВЫМ.

Па рамантыку і вандроўкі

Па рамантыку, добры настрой, вандроўкі і станоўчыя эмоцыі трэба ехаць у палатачны лагер. У гэтым перакананы юнакі і дзяўчаты, якія адпачывалі ў палатачным лагеры «Рамантык», што ў Клімавіцкім раёне.

Дарэчы, многія з іх прыязджаюць сюды штогод і вельмі задаволены тым, што ім чарговы раз выпала сустрэцца разам. Тэматыка гэтай змены (якая стартавала 1 жніўня і доўжылася дзевяць дзён) была прысвечана Году малой радзімы.

Як расказаў начальнік лагера Дзмітрый Грэбень (загадчык аддзела турызму і фізкультурна-аздараўленчай работы Клімавіцкага цэнтра дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі), для дзяцей, а на змене адпачывала 30 чалавек, была падрыхтавана цікавая праграма. Асабліва доўгачаканыя заўсёды вандроўкі па знакавых мясцінах. А іх у рэгіёне багата.

Таццяна МАЛІНІНА, фота аўтара.

Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокае спачуванне члену Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па працы і сацыяльных пытаннях ДАШКО Анатолю Міхайлавічу ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю ЖОНКІ.

Калектыў факультэта журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта выказвае шчырыя спачуванні доктару філалагічных навук прафесару кафедры медыялогіі Таццяне Уладзіміраўне Падаляк з прычыны напаткаўшага яе гора — смерці БАЦЬКІ. У цяжкі час страты смуткуем разам з Таццянай Уладзіміраўнай і выказваем сваю сардэчную падтрымку.

Камунальныя стасункі: уласны досвед

Палёт над кавалкам падлогі

Дзе раскоша, а дзе неабходнасць для жыхароў?

Некалькі гадоў таму ў нашым пад'ездзе на першым паверсе правалілася падлога. Менавіта ў тым месцы, дзе ўсе, увайшоўшы ў дзверы з вуліцы, ступаюць у калідор. З прыступачкі людзі рабілі крок уніз — і... Ступаючы ў адно і тое ж месца ўвесь час, фактычна працёрлі дзірку. ДСП — ненадзейны матэрыял, а дому ўжо больш за 40 гадоў. І калі хто не ведаў аб правалены месцы, мог і паляцець незнарок, свае і то часам забывалі і спатыкаліся. Неўзабаве праблему дзіркі ў падлозе калідора вырашылі: на старую ДСП наставілі латачку. Жыхары пад'езда тады яшчэ разважалі: вядома, часовы варыянт, бо чакаем ха капрамонту, дом 1975 года. Так і жылі.

У жніўні мінулага года капрамонт-такі пачаўся. А ў студзені 2020 рамонтнікі ТАА «Быт будрамонт» з'ехалі са двара. І пакінулі жыхароў другога пад'езда дома № 2 па вуліцы Матусевіча ў Мінску ў збянтэжанасці.

У прыватнасці, напрыканцы рамонту паклалі плітку на частку калідора каля ліфта. На тую частку, дзе да таго з падлогай усё было ў парадку, мала таго, там ляжаў лінолеум, які да рамонту быў у прыстойным стане. Але пры капрамонце пакінулі без увагі якраз тую частку калідора, дзе былі праблемы. Менавіта тут праходзіць асноўны паток наведвальнікаў пад'езда. Тут з двара ўваходзяць мала таго, што ўсе жыхары пад'езда, але яшчэ і тыя, хто ў доме не жыве, у прыватнасці, паштальёны ды супрацоўнікі розных службаў, што кідаюць аб'явы ў паштовыя скрыні, якія вісяць менавіта тут над падлогай.

Гэта галоўная частка калідора ў вуглавым пад'ездзе 9-павярховага дома. Менавіта таму, што вуглавы, калідор сапраўды не маленькі, складаецца з некалькіх частак. «Але ж і кватэр у нашым пад'ездзе больш, чым у іншых у гэтым доме, значыць, адлічэнняў на капрамонт было больш», — разважалі жыхары, аглядаючы вынікі дзіўнай работы: пры ўваходзе з дзвярэй частка калідорчыка выкладзена пліткай, а далей — на прыступку ўніз ідзе старая падлога са шчылінамі і латкамі. Прычым, верх прыступкі абкладзены, а па баках яна проста абмазаная цэментам. Тыя, каму трэба да ліфта, праходзяць праз гэтую дсп-шную падлогу, каб зноў патрапіць у цывільную зону, дзе ляжыць плітка. Сапраўды, не лагічна.

Мала таго, яшчэ адно пытанне засталося пасля капрамонту: у іншых пад'ездах таго ж дома (за выключэннем двух) прыступкі з вуліцы абсталявалі з'ездамі для калясак, што адпавядае патрабаванням часу ў арганізацыі безбар'ернага асяроддя. А тут — нічога падобнага. Да пад'езда № 2 вядзе лесвіца з найбольшай колькасцю прыступак, даволі высокая. І гэтая лесвіца напраўду вузейшая, чым у іншых пад'ездах. Дом стары, і тут жыве шмат немаладых людзей, і чамусьці не пашчасціла менавіта самаму высокаму пад'езду. Але ж ёсць куды пашырыць, прыкідвалі мужчыны. Капрамонт жа прадугледжвае паляпшэнне недасканалых канструкцый, ці не?..

А калі пытанні застаюцца, то трэба іх некаму задаць.

Зварот быў накіраваны ў «Цэнтр інфармацыйных тэхналогій Мінгарвыканкама» ў лютым гэтага года.

Праз некалькі тыдняў, 11 сакавіка, адказ прыйшоў за подпісам першага намесніка кіраўніка адміністрацыі Фрунзенскага раёна Мінска Д. С. Драпея. У ім, у прыватнасці, дадзена спасылка на загад Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі № 5 ад 04.02.2015 года, які мае назву «Аб некаторых пытаннях правядзення бягучага рамонту жыллёвага фонду». У прыватнасці, там сказана: што «ў жылых дамах, уключаных у перспектыўныя праграмы капітальнага рамонту, работы па бягучым рамонце пад'ездаў не ўключаюцца ў гадавыя планы бягучага рамонту жыллёвага фонду, а праводзяцца пры капітальным рамонце такіх дамоў за кошт сродкаў спажыўцоў». І далей невялікае ўдакладненне: «... аб'ёмы неабходных работ па рамонце пад'ездаў не ўключаюцца ў склад праектнай дакументацыі на капітальны рамонт дома».

Праўда, паабяцалі, што пытанне ўкладкі пліткі будзе разгледжана ў ходзе правядзення бягучага рамонту пад'ездаў жылога дома.

Па другім пытанні больш катэгарычна: «У жылым доме № 21 па вул. Матусевіча праводзіўся капітальны рамонт без мадэрнізацыі. А работы па пашырэнні лесвіцы адносяцца да работ па мадэрнізацыі». Паводле адказу, выканаць работы па ўсталяванні пандуса і з'езда для калясак немагчыма з-за будаўнічай асаблівасці пад'езда і небяспекі загрувашчвання шляхоў эвакуацыі пры пажары. Лесвіца сапраўды вузкая паводле забудовы. Але ж і ў такім выглядзе яна наўрад ці дапаможа належнай эвакуацыі пры пажары. Ці нельга яе хоць бы пашырыць на крайні ўзровень апорнай сцяны? Наогул пытанне мадэрнізацыі — гэта пытанне інжынернай думкі. Але заставалася паціснуць плячыма...

Чарговая вестачка (за 1.07.2020) з адміністрацыі Фрунзенскага раёна зноў абудзіла думкі: на дошцы інфармавання будуць тлумачэнні нормаў заканадаўства ў частцы выканання рамонтных работ «дадатковых памяшканняў пад'езда ўласнымі сіламі», то-бок за сродкі жыхароў. А «Жыллёвая камунальная гаспадарка № 2 Фрунзенскага раёна г. Мінска» дапаможа з закупкай матэрыялаў і выбарам падраднай арганізацыі на выкананне работы.

Гэта выдатна, што звароты застаюцца на кантролі ў чыноўнікаў, што іх выкананне адсочваюць. Гэта цудоўна, што ў адказ гатовыя даваць тлумачэнні са спасылкамі на нормы і правілы, прынятыя ў гэтай сферы. Вось толькі часам яны здаюцца дзіўнаватымі — калі бачыш, што зроблена за час капрамонту, а што тут жа пабач выглядае недаробкай. Чаму адна частка падлогі трапляе пад нормы капрамонту, а другая ў гэтым жа доме — не? Прычым, прыступка гэтай жа часткі калідора можа быць адбудавана, а яго асноўная частка — не?.. У чым логіка? Гэтая недарэчнасць выклікае ўсмешку нават у дзяцей. А дарослыя збянтэжаныя: ім прапануюць заплаціць яшчэ за рамонт «дадатковага памяшкання». Мала таго, што на пандусе лесвіцы сэканомілі ў тым пад'ездзе, дзе самая вялікая колькасць кватэр, — маглі б ужо і нешта для людзей зрабіць на кампенсацыю (паводле чалавечай логікі). Ды і галоўны калідор, без якога не было б пад'езда наогул (бо ніхто не змог бы патрапіць у кватэры, не прайшоўшы па ім) наўрад ці хтосьці лічыць «дадатковым памяшканнем» дома.

Тым больш што справа не датычыцца касметычнага рамонту ўсяго пад'езда, афарбоўкі сцен і г. д. (гэта ў пад'ездзе рабілі гадоў сем таму). Аказалася — сцены ды лесвічныя парэнчы могуць фарбаваць у планавым парадку час ад часу. А калі трэба ўмацаваць хісткую старую падлогу агульнага калідора — гэта не ўпісваецца ў нормы ні бягучага рамонту, ні капітальнага?! Канструкцыя падлогі з ДСП — нетыповая для калідораў першага паверха пад'езда, больш трывалы варынт той жа звычайны бетон. І тады сапраўды ўсе нарматывы зразумелыя. Але, напэўна ж, бываюць выпадкі, калі патрэбныя больш гнуткія падыходы. Нездарма ж у нас удасканальваюцца час ад часу нарматыўныя акты і нават законы — пад рэчаіснасць.

Калідор, праз які ідзе ўвесь паток людзей — гэта, трэба думаць, нешта надта эксклюзіўнае, нейкая раскоша? Ці не таму яго могуць рабіць толькі за дадатковую плату, якую трэба ўзяць з людзей, якія мелі спадзеў на капрамонт? Мелі спадзеў менавіта таму, што гэта ўсё ж падлога першага пад'езда, якая з'яўляецца сістэмнай (а ніяк не дадатковай!) часткай любога дома. Наогул, няма трывалай падлогі — не будзеш жыць ні ў доме, ні ў кватэры.

А што, было ж такое, што абыходзіліся наогул без яе, чаго ўжо там, — у першабытныя часы якая была падлога ў пячорах, але ж людзі выжылі...

Аднак цывілізацыя ўсё ж прапануе больш клопату пра чалавека. І вельмі хацелася б, каб усе захады па клопаце былі лагічнымі і паслядоўнымі, каб чалавек мог трывала адчуваць сябе на зямлі. Але пакуль кожны раз, праходзячы праз калідор, так і згадваеш знакамітае: «Чаму людзі не лётаюць як птушкі?»

Ларыса ЦІМОШЫК.

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703
Продавец	ГЛХУ «Смолевичский лесхоз», Минская область, г. Смолевичи, ул. Первомайская, 72а

Предмет аукциона: транспортные средства, бывшие в употреблении.
Месторасположение: Минская обл., г. Смолевичи, ул. Торговая, 41

Лот, №	Инв. номер	Наименование	Начальная цена, с НДС, бел. руб.
1	01521429	MAZ 6303 A8, грузовой специальный сортиментовоз, рег. знак AI 1823-5, кузов № Y3M6303F890000499, 2009 г. в. Установлен гидроманипулятор Логлифт – 96	39 840,00
2	01321428	MAZ 837810 022, прицеп специальный сортиментовоз, рег. знак A 6594 A-5, кузов № Y3M83781090012383, 2009 г. в.	2 640,00

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на счет BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки», УНП 191021390

Порядок ознакомления: в рабочие дни с 09.00 до 17.00 по предварительному согласованию, тел.: 801776 59051, +375 29 704 77 58 (Ермолик Юрий Николаевич)

Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней после проведения аукциона

Предыдущее извещение о проведении аукционов опубликовано в газете «Звязда» 10.07.2020 г.

Условия оплаты предмета аукциона: если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения торгов, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также информация о порядке и сроках возмещения затрат на организацию и проведение торгов указаны в условиях проведения торгов, определенных в Положении о порядке организации и проведения аукционов (конкурсов) по продаже отдельных объектов, находящихся в государственной собственности, утвержденном постановлением Совета Министров РБ от 12 июля 2013 г. № 609, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by. Организатор торгов имеет право отказаться от их проведения в любое время, но не позднее чем за 3 дня до наступления даты проведения аукциона

Дата и время проведения аукциона: 31.08.2020 в 13.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки».
Дата и время окончания приема документов: 28.08.2020 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»

Контактные телефоны: +375 (17) 280-36-37; +375 (44) 704-92-06.
E-mail: auction@cpo.by

УВАЖАЕМЫЕ АКЦИОНЕРЫ

ОАО «ЗАВОДСКОЙ РАЙПИЩЕТОРГ»!

02 сентября 2020 года в 10.00

СОСТОИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ ОАО «ЗАВОДСКОЙ РАЙПИЩЕТОРГ»
Собрание состоится по адресу: г. Минск, ул. Варвашени, 50

ПОВЕСТКА ДНЯ

1. О вхождении ОАО «ЗАВОДСКОЙ РАЙПИЩЕТОРГ» в состав государственного объединения «Главное управление потребительского рынка».

Регистрация участников собрания с 9.00 до 9.45 02 сентября 2020 года по месту проведения собрания акционеров.

Для регистрации при себе иметь документ, удостоверяющий личность (представитель акционера – и доверенность).

Время и место ознакомления акционеров с материалами по вопросам повестки дня собрания и иной информацией: в рабочие дни – с 9.00 до 17.00 по месту нахождения Общества.

Справки по телефону 017 375-32-16.

НАБЛЮДАТЕЛЬНЫЙ СОВЕТ

Информация
о формировании реестра владельцев ценных бумаг
ОАО «ЗАВОДСКОЙ РАЙПИЩЕТОРГ»

Полное наименование и местонахождение акционерного общества	Открытое акционерное общество «ЗАВОДСКОЙ РАЙПИЩЕТОРГ» 220137, г. Минск, ул. Варвашени, 50
Наименование уполномоченного органа акционерного общества и дата принятия им решения, в соответствии с которым осуществляется формирование реестра акционеров	Наблюдательный совет Открытого акционерного общества «ЗАВОДСКОЙ РАЙПИЩЕТОРГ», 13.08.2020 года
Дата, на которую осуществляется формирование реестра акционеров	27.08.2020 года

УНП 100103703

18.09.2020 в 12.00
антикризисным управляющим ООО «Без долгов» будет проводиться открытый аукцион по продаже имущества частного торгово-производственного унитарного предприятия «Алтехнотранс» в составе:

Лот № 1. Автомобиль Fiat Ducato,

тип – грузовой вагон
(2008 г. в., г/н АН 8270-5, VIN ZFA25000001313686).
Начальная цена без НДС – 3 800 бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены (380,00 бел. руб.).
Лот № 1 находятся по адресу: г. Минск, ул. Сухаревская, 70.

Шаг аукциона установлен в размере 5 %.
Задатки перечисляются на р/с BY74 PJCB 3012 0319 0110 0000 0933 в ОАО «Приорбанк», г. Минск, БИК PJCBBY2X, частное торгово-производственное унитарное предприятие «Алтехнотранс», УНП 691327739.

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 5 (пяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 10 (десяти) банковских дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Расходы по переоформлению правоустанавливающих документов на имущество и затраты на проведение аукциона несет покупатель.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте Единого государственного реестра сведений о банкротстве http://bankrot.gov.by/, а также можно с ними можно ознакомиться в офисе управляющего.

Аукцион состоится **18.09.2020 в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Сухаревская, 70, пом. 8Н. Заявления на участие и необходимые документы принимаются **по 17.09.2020 до 15.00** по указанному адресу.

Тел.: (8017) 325-33-04, (8-029) 680-72-22.

УНП 691327739

КАЛІ НЯМА СЛОЎ

НЯХАЙ ЖЫВЕ ЛАЗНЯ!

Гэтая лазня ў свой час была выштукавана ў канцы агарода — амаль на самым беразе ракі. Лепшага месца, што ні кажыце, шукай, не знойдзеш. Пасля парылкі можна скокнуць у рачную плынь, балазе, далёка бегчы не трэба, асвяжыцца, і тым самым адчуць самае што ні на ёсць харство жыцця. Цуд!

Лазня была зроблена з новых бёрнаў-круглякоў сасны вясковымі майстрамі. Майстры патроху адзін за адным адышлі ў іншы свет, не стала і гаспадара лазні, а потым і гаспадыні. Лазня асірацела. Ды што каму спатрэбіцца, тое і бяруць. З усяго навакольля едуць. І на калёсах, і на тэхніцы. Не ўпільнуеш. Такія дамкі знішчылі дабротныя, а ты пра лазню! Супакойся і забудзь. Як учарашні дзень.

Былы вясковец не супакоіўся і не забыўся. Вера Сцяпанаўна ўсё ж выдала таго чалавека, які перавёз лазню ў райцэнтр. Гэта быў сын вясковага каваля Пятро Валюшаў. Ведаў яго Іван Фёдаравіч, вядома ж: раслі разам. Пакалькі мінчук быў на легкавіку, у той жа дзень наведаўся да земляка. Той запрасіў за стол, госць адхіліў прапанову і адразу ж перавёў размову на лазню.

— Ведаеш, з якой нагоды я прыехаў да цябе, зямляк? — строга паглядзеў на гаспадара дома Іван Фёдаравіч. — Бачу, не здагадваешся. То скажу: па грошы. Я аціаніў лазню ў тысячу рублёў.

— Ого задраў! — здзівіўся райцэнтравец. — Чаму так многа? Цяпер за хату ў вёсцы столькі не даюць. З пафарбаванымі аканіцамі. Ды і згніла б твая лазня, калі б не я. Альбо хто скраў бы — шукай ветру ў полі. Ды яно неяк і не пазямляцку, Ваня... Мо, магарычом абыдземся?

— Ты за каго мяне лічыш? Лазню — за чарку гарэлкі? Рыхтуй грошы. Я пазней заеду.

Не дамовіліся.

Справу вырашаў суд. Ён пастанавіў: альбо заплаціць грошы за крадзеж, альбо вярнуць лазню на ранейшае месца. Пятро Валюшаў вярнуў будыніну на ранейшае месца. Прыехаў з двума сынамі, склаў яе за пару дзён. Быццам Вера Сцяпанаўна прызналася, што чула, як Пятро Валюшаў, пакідаючы складзеную лазню, кінуў папрок Івану Фёдаравічу: «Няхай ён падавіцца!» І паглядзеў на старую вельмі горда. Як пераможца.

Лазня нядоўга прастаяла. Нехта зноў прыбраў яе да рук. Гэтым разам Вера Сцяпанаўна не бачыла — хто. Але радавалася, што не бачыла, і шкадавала Пятра Валюшава, якога выдала. А яшчэ больш радавалася, што лазня зноў некаму спатрэбілася.

Няхай жыве лазня. Калі яна пабудавана, то павінна ж выконваць непасрэднае прызначэнне, а не стаяць сіратліва пад голым небам, чакаючы свайго апошняга дня...

Так, пэўна ж, падумала старэйшая жыхарка вёскі.

З ёй я цалкам згодны.

НЯБАЧНЫ МУЖ

— У санаторыі за адным столікам са мной сядзелі дзве вабныя жанчыны, — прызнаўся надоечы сусед Пятровіч, з якім мы абменьваліся іншы раз рознымі гісторыямі альбо проста размаўлялі пра жыццё. — Прыехалі мы ў адзін дзень, але так атрымалася, што я крыху раней, і калі пачаргова дзяжурная па зале паджсаджвала да мяне гэтых жанчын, адну ў абед, а другую ў час вячэры, я адчуваў сябе ў ролі гаспадара. Калі ласка, кажу! Давайце знаёміцца. Пятровіч. Назваліся і яны: Святлана з Рагачова і Вікторыя з Віцебшчыны, таксама з райцэнтра, а з якога — не запомніў. Але не гэта важна.

Рагачоўская кабета адразу ж пачала менш глядзець у талерку, а больш кідала позіркі на мужчын, якіх, да яе расчаравання, было не так многа. Ды і тыя, якіх не абмінулі яе вочы, наўрад ці парадаваліся — адны дзяды. Як вось і я. Што з такога возьмеш? Праўда, за змену падвярнуліся ўсё ж ёй два мужчынкі так сабе... Як сказала б наша суседка Дзіна, такіх у базарны дзень жменькамі прадаюць... альбо пучкамі... Яно і Святлану зразумееш: жыве ж адна, развядзёнка, дзеці ўжо самі па сабе, чаму б не прыгадаць маладосць? Ды каб зусім не «згарэла» пуцёўка, добра будуць і такія. Але мне больш хацелася расказаць пра Вікторыю. Слухаеш?

— Слухаю, слухаю.

— Яна мне вельмі як жанчына спадабалася. Разважлівая, мала што з твару прыгожая, у целе, смуглявая. На малдаванку змахвае. Я калі ў Кішынёве жыў, на такіх наглядзеўся. Пазней я зразумеў, чаму нас за сталом трое, нікога больш не падсяляюць: адно месца ўвесь час пуставала. Вікторыя прыехала не адна — з мужам. А ён быў інвалідам, не выходзіў з пакоя. Так я ніводнага разу яго і не ўбачыў. Нябачны муж, адным словам. Вікторыя яго надта хваліла. Пражыла, кажа, усё жыццё, як за каменнай сцяной. А потым яго хвароба адолела. Верыць ёй ці не, але казала, што ён у яе даслужыўся да палкоўніка. Я ўжо не пытаўся, а чаму ж яны тады не паехалі ў вайсковы санаторый. Іх справа. Ну, а пакольк на стол ставілі ежу і на чацвёртага адпачывальніка, то жонка спярша адносіла мужу порцыі ў сваім пакеціку, а потым ёй на кухні рабілі ўжо гатовыя пайкі. Акуратна, у кантэйнеры спецыяльныя састаўлялі ежу, там іх і забірала.

Відаць, я так разумею, Вікторыі далі пуцёўку, забыў пацікавіцца, маё ўпушчэнне, а мужа не было з кім дома пакінуць... Вось тут не скажу. А можа і яму, мужу, далі, а ёй ужо, як прыстаўленай да інваліда... заадно.

Пятровіч крыху памаўчаў, а потым падняў на мяне вочы:

— Але ж як яму, мужу Вікторыі, маглі даць пуцёўку, калі ён настолькі хворы? Калі сам на працэдуры не можа хадзіць? Маёй жа Наталлі, як ні ўпрошваў медыкаў, не падпісалі санаторную карту. Да яе нават справа не дайшла. Нельга! У яе і тое, і гэтае. Вы што, хочаце, каб нам потым з санаторыя дэпеша прыйшла — каго вы накіравалі? Дык мая ж Наталля яшчэ — уго! Мятла! А, бач, я адзін паехаў.

Памаўчалі.

— Што мяне асабліва ўразіла, дык я ніводнага разу яе не бачыў на танцульках, — працягваў далей Пятровіч. — На канцэрты там розныя прыходзіла. Звычайна адна сядала ў крэсельца, але калі каго з нас, суседзяў па стале, заўважала, прыветна ўсміхалася і падгуртоўвалася. Ці да мяне, ці да Святланы.

Пятровіч памаўчаў, уздыхнуў, і сказаў, узважваючы і смакуючы словы:

— З усяго санаторнага жыцця запомнілася больш за ўсё мне гэта. Пашанцавала ж, наколькі я зразумеў, таму нябачнаму хвораму мужу хоць у адным — з жонкай...

ЮБІЛЕЙ

Юбілеі бываюць самыя розныя. У кагосьці залатое вяселле. Нехта адзначае круглую дату з дня нараджэння. Юбілеі надараюцца не толькі ў людзей — у тэатраў, прадпрыемстваў, навучальных устаноў, школ... І гэтак далей.

Мне ж захацелася распавесці сёння пра юбілей, ад якога патыхае... горыччу.

На пятым паверсе ў нашым пад'ездзе жыла некалі рабочая сям'я з рэдкім прозвішчам Замрыевы. Бацькі, Ніна і Леанід, працавалі на заводзе, дзеці, дачка Люська і сын Сяргей, хадзілі ў школу. Што ні кажыце, а чужыя дзеці растуць вельмі хутка. Не паспеў і я азірнуцца, як дачка нашых суседзяў скончыла школу і выйшла замуж, а сына забралі ў армію. Кватэра ў доме неўзабаве засталася для дачкі з мужам, а бацькі пераехалі ў прыватны дом, які дастаўся ім у спадчыну. Здавалася б, лепей не прыдумаеш. Жыві і радуйся. Яно так і было спярша. Дачка нарадзіла адразу двух дзетак — сына і дачку. А потым пайшлі чуткі, што муж запіў, і Люська яго вытурыла. А далей, як толькі падраслі малыя, суседзі перасталі бачыць і Люську, а малых у садзік пачала вадзіць яе маці.

Адным словам, старэйшыя Замрыевы пачалі жыць на два дамы. Прыватны двор не пакінеш без нагляду, а з дзецьмі зручней у гарадской кватэры. Тут садзік якраз пад вокнамі. Ды і іншыя ўмовы лепшыя.

На маіх вачах выраслі хутка (зноў жа: што ні кажыце...) і Люсьчыны дзеці. Скончылі школу, набылі прафесіі ў каледжах, пабраліся шлюбам. Самі Замрыевы пастарэлі, ужо на пенсіі. Зрэдчас сустракаемся, вітаемся. Старыя перабраліся цалкам у прыватны дом, а тут жыве ўнук Лёшка з жонкай і дзіцем. Іншы раз я пытаўся ў Лёшкі, як там родныя, ён адказваў звычайна бадзёра: трымаюцца! Апошні раз, калі пацікавіўся, сумна адказаў:

— Бабулю інсульт ударыў. Але малайчына, не здаецца. У шпіталі ляжала больш за месяц, цяпер размаўляе. Твар выправіўся амаль. Я прывёз ёй трэнажор. Праз боль, але займаецца.

Пра Люську я не цікавіўся. Навошта вярэдзіць душу людзям. З'ехала ў Маскву на заробкі і з'ехала. Ні грошай, ні тэлефанаванняў ад яе доўга не было. Думалі пра саме горшае. «Можа яна там у маскоўскую каналізацыю правалілася?» — сумна жартаваў бацька. Потым адгукнулася і зноў прапала. Нехта з гамяльчан перадаў, што зусім нядаўна бачыў Люську ў Маскве. Цвіце і пахне!

Што ж да алімента ад былога Люсьчынага мужа, дык іх, як высветлілася, і ў вочы не бачылі. Што з яго, п'янтоса, возьмеш? Нідзе не працуе, жыве на матчыну пенсію.

Не прысылала, вядома ж, грошай і Люська.

Але ўнукі ў Замрыевых былі дагледжаныя і сытыя, як кажуць. Не горш за іншых.

А тут сустракаю надоечы Замрыевых у двары. Леанід нясе торт, а Ніна, абапіраючыся на кульбу, стараецца ад мужа не адставаць. Я кіўнуў на торт: ніяк, свята ў вас, суседзі? Ніна адказала, хоць і не адразу:

— Юбілей у нас. Сёння роўна дваццаць гадоў, як дачка ў Маскву на заробкі паехала...

І яны моўчкі пайшлі далей, а я не знайшоў, што адказаць гэтым людзям...

Драма. Шэкспір пазайздросціў бы.

Васіль ТКАЧОЎ.

Таямніцы сталіцы

ПА СЛЯДАХ МАМАНТАЎ,

або Сакрэты Сляпянкі

СЁННЯ гэты раён рэдка прыцягвае ўвагу турыстаў. Адзінае, на што людзі едуць паглядзець — на Нацыянальную бібліятэку, а часам яшчэ і на мясцовую Эйфелеву вежу, што пазначана на гугл-карце. Апошняя, сапраўды, знаходзіцца непадалёк ад Нацыяналкі, але, калі вы пабачыце гэту маленькую пабудову на дзіцячай пляцоўцы, будзеце расчараваныя. Наўрад ці вас уразіць і мінскі Крэмль — гэта дзіцячая пляцоўка ў дварах побач са станцыяй метро «Усход». Але пагуляць па раёне сапраўды варта, у гэтым перакананы гісторык, музейшчык Павел КАРАЛЁЎ, які па Сляпянцы ладзіць адмысловую экскурсію.

Зялёнае царства

Калі вы забярэцеся на аглядальную пляцоўку Нацыянальнай бібліятэкі, убачыце, колькі зеляніны навокал. Яшчэ ў даваенныя часы ваўкі з навакольных лясоў чынілі шмат шкоды мясцоваму калгасу, а каля сотні гадоў таму наогул у лесе Ваньковічаў (сёння на яго месцы знаходзіцца на праспекце Незалежнасці маюць незвычанае наверша — яны былі спраектаваны так, каб на дахах раслі кветкі, кусты і дрэвы. Напачатку яно так і было: пасля работы людзі маглі там адпачыць. Але, відаць, на той час не ўсе змаглі ацаніць такі шыкоўны праект, асобныя гараджане пачалі выпіваць у гэтых садах на даху і скідваць уніз бутэлькі.

Такія вяселлі ладзілі тут у пачатку мінулага стагоддзя.

парк Чалюскінцаў) можна было ўпаляваць мядзведзя. Людзі, якія жывуць тут гадоў сорак, могуць расказаць, як у адзін з мясцовых гастраномаў зайшоў з праверкай... лось. Дарэчы, той дом і сёння завуць «ласіным».

Менавіта тут павінна была рэалізавацца мара пра Мінск — горад-сад. Дамы

Кадкі з раслінамі давялося прыбраць. Затое мазаіку на дамах ніхто не чапаў. Хоць у савецкія часы праз яе мог разгарэцца вялікі скандал, бо ў цэнтры кожнай з кампазіцый, якія паказваюць Мінск як горад мастацтва, навукі і г. д., можна бачыць выяву жанчыны з дзіцем, што надта ўжо нагадвае

тэму Хрыста і Божай маці. А ўспомніце, якое было стаўленне да рэлігіі ў канцы 1960-х, калі на ўездзе ў горад ствараліся гэтыя шматпавярховікі.

Але і ў сучаснай забудове таксама могуць быць рэалізаваны цікавыя ідэі. Павел Каралёў запрашае завітаць у новы жылы квартал «Маяк Мінска», дзе кожны будынак прысвечаны пэўнаму мастаку: Рафаэлю, Гоі, Мадыльяні, Дэга, Пікаса, Айвазоўскаму, Рэмбранту і іншым. Два

Сядзіба Ваньковічаў.

будынкі звязаныя з беларускімі творцамі — Шагалам і Напалеонам Ордам. Ва ўтульных унутраных дворыках размясціліся тры гарадскія скульптуры — выявы мастакоў, побач з імі можна прысесці на лавачках і папіць гарбаты. У спякоту дзяцей не адцягнуць ад тутэйшага фантана. А яшчэ, калі вы

звернеце на вуліцу Кірылы Тураўскага, пройдзеце недалёка ад будынка, які па форме паўтарае васьміканцовы беларускі крыж, альбо крыж Ефрасінні Полацкай. Гэта Дом Міласэрнасці.

Таксама ў гэтым кварталe вы знойдзеце вуліцу Пятра Мсціслаўца. А вось прапанова пра наданне адной з вуліц назвы Дударская не была ажыццёўлена. Справа ў тым, што да таго, як быў пабудаваны новы жыллёвы квартал, на гэтым месцы размяшчаўся яблыневы сад (у гарадскім фальклоры «Карчы»), а ў ім любілі збірацца маладыя людзі, якіх цікавіла беларуская культура, гралі на дудзе і абуджалі ў сучаснікаў цікавасць да гэтага музычнага інструмента.

Але давайце ўсё ж вернемся да Нацыянальнай бібліятэкі. Праект яе ўзнік яшчэ ў 80-я гады, ён быў даволі смелы і незвычайны для таго часу, вось і адклалі яго на доўгія часы, і ўспомнілі толькі ў 2000-х.

Ці можаце вы ўявіць, што раней там, дзе сёння пабудавана бібліятэка, гулялі маманты? Дарэчы, па вуліцы Каліноўскага размешчана скульптурная кампазіцыя сям'і мамантаў. І гэта не выпадковасць. У сталіцы было знойдзена багата костак гэтых жывёл. Напрыклад, такія знаходкі трапляліся пры будаўніцтве метро. А самай багатай на косткі старажытных жывёл аказалася сталічная вуліца Машынабудаўнікоў — відаць, там быў нейкі могільнік мамантаў (да нашых часоў у зямлі ляжалі парэшткі каля дваццаці жывёл). Таксама ў Мінску падчас будаўнічых работ ва Уруччы ўдалося натрапіць на косткі ляснога слана. Знаходка вельмі каштоўная — падобных на Еўропу набярэцца каля дзясятка.

Сляпянская водная сістэма.

Каля вады

Яшчэ да вайны апошнія дамы Мінска знаходзіліся каля парка Чалюскінцаў, а тэрыторыю Вялікай Сляпянкі горад увабраў толькі ў канцы 50-х. Але колькі тут было зроблена для камфортнага пражывання і адпачынку гараджан. Чаго толькі вартая Сляпянская водная сістэма з яе каскадамі, з густам аформленымі падыходамі да вады, вадасховішчамі. Яе працягласць — 22 кіламетры, і тут ажыццёўлена багата розных ідэй па абсталяванні рэкрэацыйнай зоны. Дарэчы, гэта сістэма ўвабрала сапраўдную раку — Слепню.

Уздоўж канала мы рушым да сядзібы Ваньковічаў, дзе сёння размяшчаецца рэстаран, а за савецкім часам былі і бульбяная станцыя, і школа НКУС, і пошта. Часам можна пачуць, што тут жыў Валенцій Ваньковіч. Так, мастак тут бываў, але належаў дом яго сваякам. Павел Каралёў паказвае здымак, зроблены ў 1909 годзе падчас вясельля Юліі Ваньковіч. Захаваліся нават успаміны пра той дзень. «Госці былі ў святочных уборах, мужчыны у фраках, жанчыны ў вячэрніх сукенках. Брыльянты, смарагды, рубіны, якія ўпрыгожвалі жанчын сямейства Ваньковічаў, асляплялі вочы. Нават вялізная зала Сляпянкі не магла ўмясціць усіх гасцей. Пасля абеду фатаграфаваліся, прычым у фатографа шмат часу пайшло на расстаноўку такой шматлікай групы людзей».

У савецкія часы непадалёк ад сядзібы Ваньковічаў знаходзілася і дача Лаўрэнція Цанавы. З гэтым месцам звязана шмат жахлівых гісторый, але што там насамрэч адбывалася, трэба яшчэ вывучаць.

Таксама можна вызначыць, якія пабудовы ў гэтых мясцінах былі ў Радзівілаў і чаму аб Сляпянцы ходзяць пэўныя легенды. Мясцовыя старажылы яшчэ і сёння могуць расказаць пра прывіда (быццам тут павесілася паненка), і пра тое, што ў 1812 годзе цераз гэтыя мясціны французы ішлі на Маскву, але іх спыніла невядомая хвароба — яны пачалі слепнуць. А яшчэ казалі, што назва мясцовасці быццам звязана з сёстрамі-празарліўкамі, якія ў цёмную слепую ноч убачылі будучыню і прадказалі, што з'явяцца машыны (робаты), якія будуць працаваць замест людзей.

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.

Жывая гісторыя

ДАКАПАЦЦА ДА АДКРЫЦЦЯЎ

Знайсці матэрыяльныя сведчанні таго, як жылі нашы продкі сотні і тысячы гадоў таму, вывучыць і захаваць унікальныя артэфакты, а галоўнае — паназнаёміць праз шматлікія музейныя экспазіцыі са зробленымі гістарычнымі адкрыццямі шырокую грамадскасць, расказаць пра самабытнасць нашай духоўнай і матэрыяльнай культуры — вось тое, чым год за годам рупліва займаюцца айчынныя археолагі.

«Кожны археолаг марыць пра пэўныя адкрыцці, хоць для нас артэфакты — не самамэта: важней, якія веды яны даюць, якія высновы мы робім з іх дапамогай», — зазначае **намеснік дырэктара па навуковай рабоце Інстытута гісторыі НАН Беларусі Вадзім ЛАКІЗА**, які напярэдадні Дня археолага пажадаў поспеху і імпэту сваім калегам, хто працуе «ў полі» проста зараз. У вёсцы **Какорыца Драгічынскага раёна** навукоўцы і валанцёры пад кіраўніцтвам Мікалая Крывальцэвіча даследуюць старажытнае тарфяніковае паселішча эпохі неаліту і ранняга бронзавага веку. «Гэта мелася быць міжнародная экспедыцыя з удзелам нашых калег з Польшчы і Эстоніі, — дадае Вадзім Лакіза, — але праз эпідэміялагічную сітуацыю давялося сваімі сіламі выконваць тую комплексную работу, якая была запланаваная там».

Штогод да свайго прафесійнага свята археолагі падводзяць пэўныя вынікі палявога сезона. Вось і цяпер, хоць сёлета ў сувязі з эпідэміялагічнай сітуацыяй колькасць удзельнікаў раскопак і ўдзел у іх студэнтаў і школьнікаў былі вельмі абмежаваныя, Акадэмія навук выдала 154 дазволы на правядзенне археалагічных даследаванняў ва ўсіх рэгіёнах краіны. (Для параўнання: летась за ўвесь год такіх дазволаў было выдадзена 220.) Акрамя фундаментальных даследаванняў, вялікая колькасць гэтых экспедыцый звязаная з так званымі выратавальнымі работамі ў зонах новабудоўляў — узвядзенне новых раёнаў у гарадах, будаўніцтва нафтаправодаў, свідравін, добраўпарадкаванне тэрыторый, — на такія выратавальныя даследаванні сёлета ўжо выдадзена 127 дазволаў.

Дзіцячая цацка-жужалка і касцяны грэбень XII стагоддзя — знаходкі экспедыцыі «Палатыда» ля возера Чарсцвяды ва Ушацкім раёне пад кіраўніцтвам супрацоўніка Інстытута гісторыі НАН Беларусі Марата Клімава.

Сярод самых цікавых праектаў 2020-га — узвядзенне чацвёртай чаргі археалагічнага музея-скансена ў **Белавежскай пушчы**, каля вёскі Каменюкі. У межах сумеснай работы Інстытута гісторыі НАН Беларусі і Нацыянальнага парку «Белавежская пушча» тут былі праведзеныя комплексныя даследаванні на трох помніках археалогіі — каменнага, бронзавага і ранняга жалезнага вякоў, на тэрыторыі якіх цяпер будуецца новая чарга музея. На падставе знойдзеных артэфактаў гэтага часу цяпер аднаўляюцца стаянкі эпох мезаліту і неаліту, а таксама цэлая вёска бронзавага веку. Наогул на сёння музей пад адкрытым небам мае ўжо шэсць комплексаў розных гістарычных перыядаў. Першых наведва льнікаў археалагічны скансен пачаў прымаць ужо летась, з мая гэтага года турысты могуць пазнаёміцца з асаблівасцямі жыцця і побыту насельніцтва Беларусі ў раннім жалезным веку і ў перыяд эпохі Сярэднявечча.

«Не так даўно мы з калегамі вярнуліся з выратавальных даследаванняў у зоне будаўніцтва Нежынскага горнаўзбагачальнага камбіната ў **Любанскім раёне**, — расказвае Вадзім Лакіза. — Там даследавалі помнікі каменнага веку і эпохі Сярэднявечча паблізу вёскі Обчын. Падкрэслю, гэта патрабаванне нашага заканадаўства ў галіне аховы гісторыка-культурнай спадчыны: любыя земляныя, меліярацыйныя, будаўнічыя работы на сёння павінны суправаджацца археалагічнымі даследаваннямі, экспертызай спецыялістаў, выдачай заключэння аб наяўнасці ці адсутнасці археалагічных помнікаў і пры неабходнасці выкананнем мер па ахове археалагічнай спадчыны на гэтай тэрыторыі». У ліку знойдзеных на Любаншчыне артэфактаў — крамянёвыя і каменныя вырабы, фрагменты старажытнага посуду, жалезныя прадметы.

Значныя работы сёлета праводзіліся і працягваюцца ў **Полацку**, дзе на тэрыторыі Верхняга замка, крыху на поўнач ад Сафійскага сабора, будуецца кадэцкае вучылішча. Папярэдне экспедыцыі пад кіраўніцтвам Вольгі Ляўко правялі максімальна поўныя даследаванні на гэтым месцы, ход навуковых работ шырока абмяркоўваўся як у рэгіянальных і цэнтральных СМІ, так і ў сацсетках. Праца гэта, заўважым, каласальная па аб'ёмах: агульная плошча археалагічных даследаванняў складае прыкладна два гектары, а таўшчыня культурнага пласта, у якім былі зробленыя важныя знаходкі, на розных участках вагаецца ад 1,5 да 7 метраў — многія тоны зямлі, перабраныя літаральна ўручную. Зрэшты, вынікі былі вартыя гэтых намаганняў: падчас раскопак навукоўцы выявілі падмуркі храма XII-XIII стагоддзяў, а таксама некалькі драўляных будынкаў XII—XVIII стагодддзяў — падклець, калодзеж, вымастка двара, фрагменты вуліц. Устаноўлена, што гэтыя фрагменты знаходзіліся на плошчы, якая раней магла выкарыстоўвацца як месца гандлю, вялікі кірмаш, — гэтыя высновы ўскосна пацвярджаюць знойдзеныя гіркі, пломбы, усходнееўрапейскія манеты, элементы амфар... Адна з самых каштоўных знаходак — нацельны крыжык X стагоддзя скандынаўскага тыпу. Усе гэтыя артэфакты, сцвярджаюць археолагі, дазваляюць па-новаму ацаніць гістарычную значнасць Полацка як калыскі беларускай дзяржаўнасці.

Дастаткова складаныя даследаванні шмат гадоў ідуць на Крывінскім тарфяніку ў **Бешанковіцкім раёне**, дзе арганіка — вырабы з косці, бурштыну і дрэва, амулеты, упрыгажэнні — захавалася пад пластом торфу. У 2020-м, кажуць археолагі, не было зроблена такіх сенсацыйных знаходак, як летась, аднак усё адно з'явілася новая інфармацыя і сведчанні аб асаблівасцях развіцця матэрыяльнай і духоўнай культуры мясцовага насельніцтва. Напрыклад, экспедыцыя Максіма Чарняўскага выявіла фрагменты гліняных статуэтак са слядамі іх прымацавання да адзежы — выдатная прастора для навуковых гіпотэз і далейшых пошукаў. У **Лепельскім раёне** Віцебскай вобласці было даследавана паселішча Бярэшча, дзе, дарэчы, спецыялістам аказалі істотную дапамогу мясцовыя школьнікі. Таксама падлеткі — удзельнікі летніка «Юны археолаг» дапамагалі экспедыцыі Алега Ткачова на **Слонімшчыне**, вучыліся закладваць шурфы, знаёміліся з методыкай археалагічных даследаванняў. «Гэта вельмі важна для фарміравання гістарычнай самасвядомасці, — адзначае Вадзім Лакіза, — калі ў Год малой радзімы дзеці бяруць удзел у навуковых даследаваннях і на свае вочы бачаць, як жылі ў розныя часы людзі ў іх родным краі».

Шмат папрацавалі супрацоўнікі Інстытута гісторыі НАН і ў **Бялынічах**, дзе напярэдадні Дня беларускага пісьменства праводзіцца маштабнае добраўпарадкаванне тэрыторыі. Так, перад будаўніцтвам капліцы на Ільінскай гары, дзе знаходзяцца могілкі, спецыялісты правялі комплекснае археалагічнае даследаванне, часам у неспрыяльных кліматычных умовах. У выніку сумесна з антраполагамі, якія вывучалі звыш 200 знойдзеных касцякоў, выявілі ўзрост могілак — пахаванні тут праводзіліся ў XVII-XIX стагоддзях. А знойдзеныя артэфакты — кераміка і посуд, нацельныя крыжы, фрагменты адзення, манеты — дазволілі істотна дапоўніць звесткі з пісьмовых крыніц, у якіх адлюстраваная гісторыя Бялыніч.

...Безумоўна, гэта толькі частка работ, якія працягваюцца і зараз — на зямлі і пад зямлёй, а таксама пад вадой (з 2015 года Інстытут гісторыі супрацоўнічае з вопытнай камандай дайвераў), летам і ўзімку (у вёсцы Жабер Драгічынскага раёна, на руінах былога замка князёў Вішнявецкіх, даследаванні зручней праводзіць менавіта зімой, калі ўтвараецца трывалы лёд), з дапамогай будаўнікоў, выкладчыкаў і студэнтаў розных ВНУ, школьнікаў і валанцёраў... Менавіта так, супольна, удаецца адкрываць дзясяткі і сотні новых, раней невядомых помнікаў археалогіі, больш дазнавацца пра нашу гісторыю, каб з дапамогай ведаў пра дзень учарашні будаваць сённяшні — і заўтрашні.

Вікторыя ЗАХАРАВА.
Фота histmuseum.by, facebook.

Пантэон Айчыны

Міхаіл Валовіч (1806—1833)

...Юнак з маёнтка Парэчча Слонімскага павета з радасцю сустрэў у 1831 годзе вестку пра паўстанне ў Царстве Польскім супраць расійскага панавання. Не вагаўся, пакінуў сваю нарачоную і пайшоў да паўстанцаў. Яго адправілі ў Варшаву наладжваць сувязь з Вільняй. Па дарозе Валовіч і яго спадарожнікі натрапілі на засаду, іншыя разбегліся ў цемры, а сам Міхаіл, ратуючыся ад пагоні, сігануў на кані са стромкага берага ў Нёман і пераправіўся цераз раку, дабраўся да Варшавы.

Жаданай дапамогі паўстанцам ён не атрымаў. Але смелага юнака (не кожны быў здольны, рызыкуючы сабой выканаць небяспечны загад) прызначылі эмісарам на Літве і даручылі прыняць у порце Паланг карабель са зброяй. Ізноў небяспечная дарога: Паланга была захоплена царскімі войскамі. Праз небяспеку ён накіроўваецца адтуль у Варшаву. Міхаіл ганарыўся, што яму давяраюць цяжкія і адказныя задачы. Пасля ён змагаўся ў шэрагах паўстанцкага корпуса генерала Гелгуда, і, як ягоныя таварышы, перажываў горыч паражэння, ганьбу ад здачы зброі прускім уладам, расчараванне і скруху ў вязніцах Прусіі. Для яго стала відавочна, што «паўстанне, узначаленае шляхтай, не мела чалавекалюбівай мэты». А мэтай Валовіча было вызваліць сялян ад прыгоннага ярма і даць ім зямлю, пра што і забыліся кіраўнікі паўстання. Свабодная краіна — гэта там, дзе свабодныя людзі, і яны гаспадары краіны, а не прывілеяваныя алігархі, якія душаць народ... Лагічна, што ў Парыжы Валовіч зблізіўся з вольнадумцам Іахімам Лялевелем, пад яго ўплывам стаў прыхільнікам сацыяльнай рэвалюцыі і далучыўся да партыі Юзафа Заліўскага.

Паплечнікі Заліўскага марылі падняць народнае паўстанне ў Польшчы, Беларусі і Літве, верачы ў агульную еўрапейскую рэвалюцыю. Валовіч прыняў прапанову Заліўскага вярнуцца на Беларусь і разгарнуць паўстанніцкі рух у Слонімска-Навагрудскай акрузе. «На сябе на наш люд, на сябе саміх можам толькі і павінны спадзявацца: не на паноў, не на дыпламатыю, не на іншае. А зрэшты, што нас чакае? Якая будучыня? Гультайства, звады, нікчэмнасць, а тым часам нашых у краі мучаюць, катуюць, вывозяць у Сібір, выбіраюць рэкрута. Разлаванае рэкрутчынай нашае сялянства чаго не зробіць, калі мы дамо яму вольнасць і зямельную ўласнасць, тады зраўняем са шляхтай, што да паноў... але што там спадзявацца на цвярозую ацэнку? Досыць, што хто дзельны ў эміграцыі, у якім ёсць душа, то пойдзе. Далі мы сабе словы, і размовы скончаны», — казаў Міхаіл. Канешне, гэта былі наіўныя спадзяванні, але тое і вылучае змагароў, што яны гатовы і ў безнадзейным становішчы паказаць прыклад іншым, усяляць у сэрцы баязлівых веру ў перамогу. Валовіч. Ён свядома выбраў свой шлях. Ведаў яго смяротную небяспеку, таму на выпадак арышту гатовы быў на самагубства, «бо хто можа быць упэўнены ў сілах сваіх, што катаванне вытрымае; калі мяне зловяць, калі на пакуты пацягнуць, страшэнна падумаць, што ў аслабленні мог бы вораг з якой балючай жылы выцягнуць слова якое неасцярожнае альбо заплачу ў пакутах».

На пачатку 1833 года Валовіч адправіўся ў Беларусь. Ні памочнікаў, ні дастаткова грошай, ні явачных адрасоў яму не далі, толькі чужы пашпарт ды два рэвальверы. Няма чаго дзівіцца, што выправа скончылася поўным правалам.

Перайшоўшы прускую мяжу Валовіч і Юзаф Яцкевіч, які далучыўся да яго ў Познанскім княстве, прабраліся па лясных сцежках у Слонімскі павет. На месцы Валовіч перакануаўся, што яго вера ў народ была занадта аптымістычная. Шляхта, напалоханая царскімі карамі, ціха сядзела і баялася нават думаць пра паўстанне. А сяляне былі пакорлівыя сваёй гарапашнай долі. У такім безнадзейным становішчы Валовіч лічыў ганьбай адмовіцца ад пастаўленай мэты. Гэта быў яго самы важны загад — загад сэрца. Ні цяжкая хвароба, ні арышт Яцкевіча, якога схапілі па дарозе ў Вільню, нішто не спыняла Міхаіла. Ён усё ж сабраў атрад з дзесяці чалавек. Актыўнай дзейнасцю Валовіч спадзяваўся прыцягнуць да сябе больш паўстанцаў, а пасля напасці ў Слоніме на турму і вызваліць адтуль вязняў.

Паўстанцы напалі на паштовую карэту. Кучар вырваўся з акружэння, збіўшы коньмі двух паўстанцаў, адзін з якіх неўзабаве памёр. Гэты напад устрывожыў улады, пачаліся аблавы. Сам імператар Мікалай I загадаў узяць «бунтаўшчыка» жывым або мёртвым. На пошукі Валовіча ўлады выгналі шэсць тысяч сялян. На дарогах стаялі вайсковыя і паліцэйскія каравулы. Да часу Міхаіл і яго таварышы (пяць чалавек збегла) пазбягалі аблавы, хаваліся ў лесе, пад мастамі, у закінутых будынках. Але 14 мая іх высачылі паблізу Парэчча і акружылі ў балоце паліцыя і сяляне. Валовіч паспрабаваў угаварыць сялян: «Навошта вы мяне бераце, вы абцяжараны панамі, працай і іншым, а я зусім вам не раблю ніякай шкоды і хацеў бы заваяваць вам свабоду». Але над сялянамі стаў жандарскі прымус. Спроба самагубства скончылася няўдала, пісталет даў асечку, тут на яго накінуліся...



На допытах Валовіч трымаўся годна, здрадаў не купляў сабе жыццё. Прама сказаў: «Я хацеў выкарыстаць мяркуемае паўстанне для майго намеру вызвалення сялян».

Пакаранне Валовіча царскія ўлады правялі 2 жніўня 1833 года ў полі за Гародняй «со всевозможною торжественностью». Міхаіл сказаў, што яго паплечнікі не заслужылі суровага пакарання, хоць так хацеў выгарадзіць іх (яны былі сасланы ў Сібір). Прызнаў, што толькі ён вінаваты і хоча памерці за Айчыну. Цела закапалі ўпотай. Але імя Міхаіла Валовіча засталося ў гісторыі і ўвайшло ў трагічны спіс герояў, пакараных за любоў да радзімы. Паўстанец Міхаіл Валовіч верыў, што ягонае самаахвяраванне «сагрэе дух, стынучы ў народзе».

Вітаўт ЧАРОПКА.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Мирополье» (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже:

лот № 1: здания административно-хозяйственного *(составные части и принадлежности: цокольный этаж, крыльцо)* **с инв. № 610/С-57979 общей площадью 439 кв. м, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 620887403601000302 (право аренды по 02.02.2113) площадью 0,4633 га по адресу: Минская область, Борисовский район, Пригородный с/с, д. Житьково, ул. Новая, 15А.**

Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав: *охранная зона линий электропередачи напряжением до 1000 вольт, пл. 0,0213 га; охранная зона линий электропередачи напряжением свыше 1000 вольт, пл. 0,0249 га; водоохранная зона водных объектов, пл. 0,4186 га; прибрежная полоса водных объектов, пл. 0,0447 га.*

Начальная цена с НДС (20 %) **– 52 118,93 бел. руб.** *Цена снижена на 20 %.* Задаток 10 % от начальной цены – **5 211,00** бел. руб.

Лот № 2: комплекса зданий и сооружений «Тепличный комбинат», расположенных на земельном участке с кадастровым номером 620887408101000475 (право аренды по 29.03.2035) площадью 13,4555 га по адресу: Минская область, Борисовский район, Пригородный с/с, д. Пчельник, ул. Советская, 1И, в составе:

- тепличный комбинат *(составные части и принадлежности: административное здание, бойлерная, теплицы)* **с инв. № 610/С-61921 общей площадью 23 914 кв. м;**

- административное здание (проходная) *(составные части и принадлежности: площадки и проезды, два ограждения)* **с инв. № 610/С-61932 общей площадью 127,9 кв. м;**

- весовая с инв. № 610/С-61928 общей площадью 64,7 кв. м;

- пункт техобслуживания техники с инв. № 610/С-61930 общей площадью 122,3 кв. м;

- стекольная с навесом для хранения минеральных удобрений *(составные части и принадлежности: пристройка)* **с инв. № 610/С-61926 общей площадью 244,2 кв. м;**

- склад удобрений, ядохимикатов с инв. № 610/С-61931 общей площадью 348,6 кв. м;

- сети водопровода с инв. № 610/С-61924 протяженностью подземной прокладки 1614 м;

- сети канализации с инв. № 610/С-61923 протяженностью подземной прокладки 401,93 м;

- водонапорная башня с инв. № 610/С-61922 общей площадью 9 кв. м.

Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав: *охранная зона электрических сетей, пл. 0,5185 га; охранная зона объектов газораспределительной системы, пл.0,3080 га.*

Начальная цена с НДС (20 %) **– 519 050,60 бел. руб.** *Цена снижена на 20 %.* Задаток 10 % от начальной цены – **51 905,00** бел. руб.

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации». Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона в размере: 5 (пяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона по лоту № 1, 2 (двух) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона по лоту № 2. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Предыдущие извещения опубликованы в газете «Звязда» от 16.04.2020, 05.06.2020. Аукцион состоится **02.09.2020** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **01.09.2020** до **16.00** по указанному адресу.

Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17. УНН 600134365

Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона	**ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703**
Продавец	**ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, пр-т Машерова, 29**

Предмет аукциона

Банк (здание специализированное финансового назначения), общ. пл. **2379,7 кв. м**, инв. № **400/С-3725**, по адресу: **г. Гродно, ул. Мицкевича, 3.** Составные части и принадлежности: подвал ((А4/к)), навес (а). Начальная цена с НДС 20 % – **3 943 572,36 бел. руб.**

Обременение: договор аренды. Подробная информация на сайте WWW.CPO.BY

Сведения о земельном участке: предоставлен на праве постоянного пользования общей площадью 0,1086 га для обслуживания административного здания (головной филиал по Гродненской области).

Дополнительная информация. При приобретении предмета аукциона, победитель аукциона или единственный участник аукциона заключает с Продавцом договор купли-продажи имущества, относящегося к предмету аукциона **на сумму 52 983,76 бел. руб. с НДС 20 %.** Состав имущества и цены размещены на сайте организатора торгов www.cpo.by

Дата и время проведения аукциона: 07.09.2020 в 15.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки». Дата и время окончания приема документов: 03.09.2020** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»**

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок заключения договора купли-продажи: 20 календарных дней после проведения аукциона

Условия оплаты предмета аукциона: победитель аукциона или единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 % (далее – единственный участник аукциона), обязан произвести оплату в размере 100 % стоимости имущества не позднее **30** календарных дней с момента заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by.

Передача предмета аукциона победителю аукциона (единственному участнику аукциона), заключившему договор купли-продажи, производится по акту приема-передачи в течение 10 (десяти) рабочих дней с момента полной оплаты стоимости недвижимого имущества.

Победителю аукциона (единственному участнику аукциона) обратиться за государственной регистрацией перехода права собственности на недвижимое имущество после передачи ему имущества в установленном порядке.

Расходы, связанные с организацией и проведением торгов, заключением (удостоверением) договора купли-продажи, в том числе оплатой государственной пошлины, государственной регистрацией договора и перехода права собственности на недвижимое имущество, а также с удостоверением сделки, включая оплату государственной пошлины, несет победитель аукциона (единственный участник аукциона), заключивший договор купли-продажи

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 31.07.2020 г.

Контактные телефоны	**+375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Организатор аукциона	**ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5, корп. 2, пом. 1703**
Продавец	**ООО «МВЗ ПромСервис», 220033, Минск, пр-т Партизанский, 8, корп. 12, пом. 55**

Предмет аукциона: транспорт, спецтехника, оборудование, бывшие в употреблении.
Адрес: г. Минск, пр-т Партизанский, д. 8, корп. 12

№ лота	Наименование, модель, инв. №	Начальная цена (без НДС), бел. руб.	Шаг аукциона, бел. руб.
1	Автопогрузчик HC CPCD35N-RW13, инв. № 417016	13 150,40	657,52
2	Машина листогибочная трехвалковая, инв. № 426498	8 200,00	410,00
3	Машина обрабатывающая ИВ-2143П, инв. № 426476	12 900,00	645,00
4	Ножницы для резки листового металла 3121, инв. № 443218	8 790,50	439,53
5	Ножницы НА-3121, инв. № 443231	8 735,00	436,75
6	Станок ленточнопильный ARG220, инв. № 440902	5 332,50	266,63
7	Установка воздушно-плазменной резки БМТ 1530ПР, инв. № 888938	25 743,90	1 287,20
8	Установка экструзионная ММВЗ Н-06-86-000-00, инв. № 434124	7 400,00	370,00
9	Шкаф сушильный LF-240/300-VS1, инв. № 506777	3 020,00	151,00

Порядок ознакомления: осуществляется по предварительному согласованию, контактный телефон: Жогло Юрий Александрович, +375 (44) 778-67-68, пн – пт с 8.00 до 17.00

Лица, желающие принять участие в аукционе, обязаны внести задаток и подать организатору торгов в установленный срок заявление с приложением всех необходимых документов

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; УНП 191224638; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка»

Порядок оформления участия в аукционе, критерии выявления победителя торгов и порядок оформления результатов аукциона определяются ст. 127, 128, 129 Закона Республики Беларусь от 13.07.2012 № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)» (далее – Закон).

Порядок оформления участия в аукционе: лица, желающие участвовать в аукционе, обязаны подать организатору аукциона в срок до 17.00 16.09.2020 заявление на участие в аукционе с приложением документов согласно ст. 127 Закона.

Критерии выявления победителя аукциона: имущество считается проданным лицу, которое предложило на аукционе самую высокую цену.

Порядок оформления результатов торгов: победитель торгов (претендент на покупку) в день проведения торгов подписывает протокол

Срок подписания договора купли-продажи	**10 (десять) рабочих дней** со дня проведения торгов

Условия оплаты предмета аукциона

Победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%, обязан оплатить предмет аукциона в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее **30 (тридцати) дней** со дня проведения торгов, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов

Победитель аукциона либо единственный участник, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить затраты на организацию и проведение аукциона, а также оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере **3 (три) процента** от цены продажи предмета аукциона в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона. Подробная информация о проведении аукциона размещена на сайте www.cpo.by

Организатор открытых торгов после опубликования извещения о проведении торгов вправе отказаться от их проведения при продаже имущества должника в любое время, но не позднее чем за пять дней до наступления даты его проведения

Дата, время и место проведения аукциона: 18.09.2020 в 14.00, г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ООО «ИПМ-Консалт оценка»

Для участия в аукционе необходимо подать организатору торгов заявление с приложением всех необходимых документов, а также перечислить задаток в срок с 9.00 **18.08.2020** до 17.00 **16.09.2020** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ООО «ИПМ-Консалт оценка»

Контактные данные: +375 17-280-36-37; +375 44-704-92-06. E-mail: info@ipmtorgi.by

Открытый аукцион № 07/20 по продаже зданий в г. Гродно по ул. Аульская, 36 и 36А

Организатор аукциона	**ООО «Реалконсалтинг», адрес: ул. Пономаренко, 35А, пом. 701, каб. 8, г. Минск, 220015, Республика Беларусь, телефон/факс: + 375 (17) 256-61-35**

Аукцион состоится 01.10.2020 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Пономаренко, 35А, пом. 701. Продавец – ЗАО Банк ВТБ (Беларусь)

№ лота	Предмет аукциона	Местонахождение	Площадь, кв. м	Начальная цена продажи с учетом НДС, руб.	Сумма задатка по лоту, руб.
1	Капитальное строение с инв. № 400/С-13597 (назначение – **здание административно-хозяйственное**), участок 0,2757 га	г. Гродно, ул. Аульская, 36	970	**159 000**	8 000
2	Капитальное строение с инв. № 400/С-13339 (назначение – **здание специализированное иного назначения**), участок 0,0158 га	г. Гродно, ул. Аульская, 36А	42	**3 100**	300

Порядок проведения и выбора победителя	Открытый аукцион на повышение начальной цены проводится с шагом аукциона в размере **5 процентов** от начальной стоимости предмета аукциона. Победителем объявляется участник аукциона, предложивший наиболее высокую цену. В случае когда в аукционе примет участие один участник либо на аукцион явится один участник (далее единственный участник), предмет аукциона продается этому участнику по начальной цене, увеличенной на 5 процентов, с его согласия
Прием заявлений	Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 9.00 до 18.00, по адресу: г. Минск, ул. Пономаренко, 35А, пом. 701, каб. 8. **Последний день приема заявлений: 28.09.2020 до 17.00**
